Дажынкі ў Студзянках ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Памяці рыцараў... ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 38 (2680) Год LII Беласток, 23 верасня 2007 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Жыццё як у рэзервацыі?

Клаўдзія і Паўліна на фоне свайго партрэта

Марыся Монах (злева) і Аліцыя Фронь

У галовах людзей часам узнікаюць шалёныя думкі, але часам здаровае шаленства патрэбнае для таго, каб знайсці спосаб спазнаць сябе. Праект „Мост над акіянамі" нарадзіўся ў галовах трох фанатаў. Іх цікаўнасць свету праявілася ў любові да культуры індзейцаў. Аднак маюць яны ў сабе настолькі адвагі, каб сваім зацікаўленнем заражаць іншых. Бартош Глябовіч, Аліцыя Фронь ды Марк Гыек рашыліся занесці крыху радасці маладым індзейцам з племя Анейда ў Канадзе і даць ім магчымасць глянуць на сваё жыццё з іншай перспектывы, з-за аб'ектыва фотаапарата. Бартош і Аліцыя пазнаёміліся ў Ягелонскім універсітэце, які супрацоўнічае з Такійскім фондам. Вось гэты фонд і прызначыў сродкі на рэалізацыю праекта.

— Першапачаткова гэта мела быць паездка ў індзейскую рэзервацыю, — расказваюць Бартош і Аліцыя. — Нашай ідэяй было зрабіць штосьці, чаго яшчэ не было, парушыць дзяцей, каб збоку глянулі на сваё грамадства ў рэзервацыі, каб крыху пагулялі з фотаапаратам. Жывуць яны ў забытым месцы, дзе пашыраюцца хваробы, алкагалізм, наркаманія. Гэта было важнае, тым болей што яны пасля ездзілі з аўтарамі здымкаў па Канадзе і Злучаных Штатах, наведвалі іншыя месцы, дзе жывуць людзі з племя Анейда, пераадолелі тысячу кіламетраў, едучы з выстаўкай у штат Вісконсін. Адказным за аб'яднанне ў пэўным сэнсе двух светаў з'яўляецца Марк Гыек, — дадаюць, — гэта ён паказаў магчымасць правядзення акцыі ў двух зусім розных месцах, што давяло да абмену кантактамі паміж дзяцьмі, якіх раздзяляюць акіян і культура. Гэтага чакала таксама ад нас камісія, якая ацэньвала праект.

Пасля двух месяцаў пабыўкі ў Канадзе і часу праведзенага з дзяцьмі ў Новай Волі, 14 верасня адкрылася выстаўка на агароджах школы ды нававольскіх панадворкаў. Ствараецца таксама ўжо інтэрнэт-сайт, на якім можна будзе аглядаць больш чым тыя сорак фатаграфій, якія з моманту адкрыцця будуць вандраваць з Новай Волі праз Міхалова (16.09.) і Геранімова (22.09.) у Супрасль (29.09.). Чаму праект праходзіў у Новай Волі? Аб гэтым расказвае Марк Гыек.

Маладыя індзейцы з племя Анейда

— Я прыўважыў істотныя аналогіі між паўночнаамерыканскімі індзейцамі і жыхарамі падляшскіх вёсак, з беларускімі і праваслаўнымі каранямі. Гэта гістарычныя аналогіі — пазбаўленне зямлі, этнічныя праблемы, барацьба за тоеснасць, але і змаганне з дэнацыяналізацыяй. З другога боку я шчыра зацікаўлены ідэяй Вялікага княства Літоўскага, якое тут існавала. Яго спадчынай з'яўляюцца людзі, адкрытыя на другога чалавека і талерантныя. А самая Нова Воля таму, што арганізацыйна была ідэальная: школа, філія асяродка культуры, гарантыя дапамогі з боку войта і дырэктар Гміннага асяродка культуры Анны Дабравольскай. А і я сам ведаю гэтую тэрыторыю.

— Дзеці ў Новай Волі здаюцца быць больш адкрытымі, можа таму што ўспрымаюць нас як сваіх, — здаецца пацвярджаць словы свайго сябры Бартош Глябовіч. — У анейдаў я пабываў пяць разоў, Аліцыя два, і нягледзячы на гэта адчуваўся нейкі недавер. Тут, у Новай Волі, дзеці працавалі больш ахвотна, з большым захапленнем і, на маю думку, здымкі тут атрымаліся крыху лепшыя.

Адной з вылучаных удзельніц польскай часткі праекта з'яўляецца Марыся Монах, многа здымкаў якой можна пабачыць у Новай Волі. А чаму яна прыняла ўдзел у праекце?

— Пані Аліцыя да нас прыехала і папрасіла ўзяць удзел. Я ахвотна згадзілася, бо люблю рабіць здымкі. Бацька часам дае мне фотаапарат. Найбольш люблю здымаць краявіды. А тут на здымку могілкі, бо ў іх жыве гісторыя. Бабуля мне сказала, што калі да зямлі прыложыш вуха, чуваць царкоўныя спевы.

Прыняць удзел у праекце сваіх дачок заахвочваў таксама нававольскі бацюшка.

— Казаў, што гэта напэўна нам прыдасца — кантакты з іншай культурай, людзьмі, практыкаванні на англійскай мове, — кажуць Клаўдзія і Паўліна, — а і мы самі хацелі даведацца як жывуць індзейцы, якая ў іх вопратка, працяг ☞ 11

XI Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XI Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група:** дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група:** астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, надрукаваныя на прынтэры або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 149** з прыпіскай на канверце: XI Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **16 лістапада 2007 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў снежні 2007 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Узнагароды

1. Арганізатары прыдбалі вартасныя ўзнагароды.

2. Арганізатары ўстанаўліваюць 1-3 узнагароды для найлепшых дэбютантаў. Аб падзеле і вартасці астатніх узнагарод рашае ўстаноўленае арганізатарамі журы.

Сакратарыят конкурсу:
Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok, tel. 085 743 50 22.

Конкурс праводзіцца пры фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

Ганебныя слупы

На мінулым тыдні „вся прагрэсівная абшчэ-ствяннасць і маладзёж” Беларусі адзначала „вялікі юбілей” — пяць гадоў з часу ўтварэння БРСМ (Белорусского Республиканского Союза Молодёжи). У народзе гэтую арганізацыю трапна і ёмка называюць „лукамолам”. Называюць зусім невыпадкова, бо БРСМ па сваёй сутнасці нішто іншае як аналаг і паслядоўнік савецкага камсамола. У адзін з урачыстых дзён давялося мне ехаць праз Мінск па „Проспекте победителей” (каго і хто перамог невядома, але зараз гутарка не пра гэта). Абапал дарогі ля кожнага слупа былі выстаўлены дзяўчыны — кожная з двума каляровымі шарыкамі ў руках. Ні то старшакласніц мабілізавалі, ні то першакурсніц. Нібыта ў гэты дзень па праспекце на аўтамабілях павінны былі праехаць замежныя дэлегацыі — з Кітая, Індыі, Венесуэлы, В’етнама і іншых „дружаственных стран”. Глядзелася гэтая вітальная каманда як знакамітая стомятроўка прастытутак на іншым праспекце сталіцы. Гэтыя маладзенькія дзяўчаткі пры слупах — ганьба перш усяго для тых, хто прымусіў іх так стаяць — гэта значыць выкладчыкаў і настаўнікаў, якім аддалі адпаведны загад зверху кіраўнікі сённяшняй дзяржаўнай ідэалогіі.

Хто ж яны сённяшнія лідэры БРСМ? Мяркую, сярод іх мала ідэйных „кансамольцаў” (старыя людзі калісьці вымаўлялі гэтае слова з асаблівым смакам праз літару „н”). Частка моладзі, каб не страціць працы ці навучання, змушаная стаць у шэрагі БРСМ. Але гэта шэрагоўцы. Што датычыць актывістаў, то бальшыня з іх звычайныя кар’ерысты ды рознага кшталту прыстасаванцы-цынікі, якія ідуць туды дзе „мякчэй і цяплей”. Так што ў БРСМ добраахвотна імкнуцца пераважна тыя, хто прагматычна хоча займець нейкія ільготы. Прыкладам такія ільготы гарантаваныя ў розных спартовых секцыях, гуртках, дзе сябрам „правільнай арганізацыі” даюцца грашовыя зніжкі пры аплаце. Не ведаю як цяпер, а колькі год таму членам БРСМ нават выдавалі адмысловыя кніжачкі пад тытулам „Скидки”. У іх па ўсіх абласцях краіны былі пералічаны ўстановы, прадпрыемствы і пункты бытавых паслугаў, дзе сябры БРСМ могуць атрымаць грашовыя зніжкі.

Што датычыць іншай часткі беларускай моладзі, менавіта беларускамоўнай, а значыць „няправільнай” з гледзішча афіцыйнай ідэалогіі, то яна працягвае жорстка і брутальна пераследавацца. На мінулых тыднях адбыліся масавыя затрыманні моладзевых актывістаў пад Оршай, у Салігорску і Баранавічах. Пад Оршай людзі сабраліся, каб адзначыць Дзень беларускай вайсковай славы — чарговыя ўгодкі бітвы пад Оршай. Зрабіць гэта належна сілы „правапарадку” не далі, здзейсніўшы масавыя затрыманні. А ў Салігорск і Баранавічы моладзь прыехала, каб выступіць у абарону сяброў Маладога Фронту, якіх судзілі за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі. Як быццам у сённяшняй беларускай дзяржаве магчыма зарэгістраваць якую-небудзь грамадскую арганізацыю?! Прытым міліцыя і КГБ не грэбуюць метадамі, нявартымі для людзей, якія носяць на плячах пагоны і называюць сябе афіцэрамі.

У Гродне супрацоўнікі КГБ проста з працы забралі на допыт аднаго з моладзевых лідэраў Максіма Губарэвіча. Пасля таго як яго паўтары гадзіны пратрымалі ў „чэкісцкім” пастарунку, нібыта выпусцілі. І амаль адразу затрымалі на вуліцы ўжо міліцыянты, нібыта за лаянку матам і парушэнне грамадскага парадку. Ну а суд хуценька аформіў трое сутак адміністрацыйнага арышту. І як, скажыце, можна назваць такіх службовых асоб, што распрацоўваюць і выконваюць такія „спецаперацыі”? Баюся, што нават папера не сцерпіць тых слоў, якіх яны заслугоўваюць. Заўважу толькі яшчэ адну акалічнасць. Як толькі еўрапейскія структуры пачалі запрашаць на розныя міжнародныя канферэнцыі прадстаўнікоў беларускай улады, рэпрэсіі супраць беларускамоўнай актыўнай моладзі рэзка ўзмацніліся. Так што ўсім тым, хто займаецца палітыкай, трэба думаць пра маральную адказнасць. Таму што ў гістарычнай памяці кожны можа апынуцца ля ганебнага слупа.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

У Супраслі „Песня пра зубра”

Згадваецца 1980 год, калі мне, першакурсніку філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта, выкладчыца лацінскай мовы Галіна Іванаўна Шаўчэнка дала грошы і сказала: „Бяжы ў цэнтральную кнігарню і купі 5 паасобнікаў кнігі „Песня пра зубра” Міколы Гусоўскага. Без кніг не вяртайся”.

Разам з аднакурснікам Леанідам Трубачом мы пабеглі на Ленінскі праспект (цяпер праспект Незалежнасці) да цэнтральнай кнігарні. Яна якраз была зачынена на абед, але каля дзвярэй на вуліцы стаялі ў чарзе па Гусоўскага ўжо некалькі дзесяткаў чалавек. Калі абед скончыўся і дзверы ў краму адчынілі, нам неяк удалося першымі апынуцца каля кніжнага прылаўка і купіць 5 кніг. Шчаслівыя мы вярталіся на факультэт, трымаючы ў руках цудоўнае выданне „Песні пра зубра” на лацінскай, беларускай і рускай мовах. Кнігу прыгожа аформіў Яўген Кулік. На беларускую мову твор пераклаў Язэп Семяжон, а на рускую — Язэп Семяжон і Якаў Парэцкі. На той час гэта была вялікая падзея як у літаратурным жыцці Беларусі, так і ў мастацка-выдавецкім. Кніга тады выйшла з друку 15-тысячным накладам і разышлася імгненна.

За гэтыя 27 гадоў „Песня пра зубра” Міколы Гусоўскага выходзіла яшчэ некалькі разоў асобнымі выданнямі. Пра яе шмат пісалі Мікола Грынчык, Рыгор Бярозкін, Уладзімір Калеснік, Віктар Каваленка, Міхась Тычына, Віктар Дарашкевіч, Алег Лойка, Вячаслаў Чамярыцкі і іншыя беларускія даследчыкі гісторыі літаратуры. Згадвалі пра „Песню...” і польскія, літоўскія, рускія даследчыкі.

Я прыгадаў свой студэнцкі ўспамін невыпадкова. Добра памятаецца, якою радасцю свяціліся мае вочы і вочы майго аднакурсніка, калі мы неслі ў руках пяць кніжак гэтага гераічнага эпаса. А Галіна Іванаўна Шаўчэнка, як убачыла выданне, ад радасці і задавальнення чуць не заплакала. На заліку па лацінскай мове яна мне нават даравала тое, што я не змог вывучыць усе 100 прымавак па латыні. „Цябе выратаваў Мікола Гусоўскі”, — сказала яна, усміхнулася і паставіла залік.

Тую радасць, а можа і большую, якую атрымала некалі мая выкладчыца латыні ў БДУ Галіна Шаўчэнка, адчуў я нядаўна ў Супраслі каля Беластока, калі мне падаравалі шыкоўнае супервыданне „Песні пра зубра” на польскай, беларускай, літоўскай, рускай, ангельскай і на мове арыгінала. Кніга толькі што выйшла з друку ў Супраслі.

Два гады назад і было вырашана выдаць вянец паэма-творчага майстэрства Міколы Гусоўскага „Песню пра зубра”. Сёлета план „Урачыска” ажыццявілі. Ва ўступным слове да супрасльскага выдання „Песні...” Кшыштаф Вольфрам падкрэсліў: „Нам, людзям „Урачыска”, падалося абавязковым не толькі прыгадаць гэтую незвычайную паэму, але і значна ўзбагаціць новы выпуск чарговымі моўнымі версіямі: літоўскай, беларускай, расійскай, інакш кажучы, літаратурнымі версіямі народаў тых краін, на тэрыторыі якіх зубр жыў у часы Міколы Гусоўскага. Зараз Мікола Гусоўскі трактуецца ў кожнай краіне як нацыянальны паэт... Найноўшы выпуск паэмы „Песня пра зубра” з’яўляецца не толькі прыгадваннем і аднаўленнем літаратурнай справы. Найперш ён павінен выканаць азнаямляльна-адукацыйныя функцыі і папулярызаваць від, які засяляў калісьці ўвесь еўрапейскі кантынент. Гэтыя каралеўскія жывёлы з-за сваёй магутнасці заўсёды былі бясспрэчнымі ўладарамі бязмежных пушчаў і стэпаў Рэчы Паспалітай абодвух Народаў, найвялікшай дзяржавы Еўропы XVI стагоддзя”.

„Песню пра зубра” у 1967 годзе на беларускую мову пераклаў Язэп Семяжон, а пераклад апублікаваў у часопісе „Полымя” ў 1969 годзе. Пераклаў на беларускую мову „Песню...” і Уладзімір Шатон (апублікавана ў „Спадчыне” ў 1991 годзе). У 1996 годзе ў часопісе „Запісы” (№ 22) з’явіўся новы пераклад „Песні пра зубра” Наталлі Арсенневай. Менавіта яе беларускамоўны варыянт і ўзялі складальнікі і выдаўцы новага супрасльскага выдання. Прысвячэнне Боне Сфорца пераклаў Віктар Дарашкевіч. Рускамоўны варыянт змешчаны ў перакладзе Язэпа Семяжона і Якава Парэцкага.

Фаліянт „Песні пра зубра”, што з’явіўся ў Супраслі, уражвае адразу. Кніга надрукавана на якаснай крэйдавай паперы з устаўкамі карцін мастакоў XIX-XX стагоддзяў, сярод якіх Ю. Косак „Змаганне зброў” (1863), В. Брахоцкі „У Белавежскай пушчы” (1885), Я. Сакалоўскі „Зубр” (1826), Я. Машчыньскі „Зубр” (1830) і іншыя. Да выдання далучаны і дыск з тэкставымі запісамі твора Міколы Гусоўскага.

Сяргей ЧЫГРЫН

Вачыма еўрапейца

Нас усё менш

Мала нас, мала нас для пячэння хлеба... — хочацца мне апошнім часам падспеўваць дзіцячую песеньку. А гэта з-за таго, што за найбліжэйшы час рэзка скарачаецца лік грамадзян Польшчы. А гэта таму, што меншае лік родаў, што кране — і ўжо кранае — таксама іншыя краіны Заходняй і Усходняй Еўропы. У сувязі з узрастаючай перавагай сконаў над народзінамі і ўсё большай працягласцю жыцця, апагей працэсу старэння польскага грамадства мае наступіць у 2020 годзе. Сёння сярэдні ўзрост у Польшчы складае 37 гадоў. У наступных гадах гэты ўзрост павялічыцца да 45. Лік асоб у гэтак званым працоўным узросце значна павялічыцца, а паменшае ў дапрацоўным. З прагноз Галоўнай статыстычнай установы вынікае, што на працягу найбліжэйшых дваццаці гадоў лік жыхароў Польшчы паменшае на больш за два мільёны чалавек ды да таго, вядома, у выніку дэмаграфічных змен, а не эміграцыі, якая ўжо цяпер, пасля адкрыцця рынкаў працы ў краінах Заходняй Еўропы, лічыцца ў мільёнах. Гэтыя з’явы турбуюць не толькі сацыёлагаў ці іншай масці аналітыкаў ды палітыкаў, але і бізнесменаў. Нядаўна я размаўляў з шэфам фірмы „Пронар” Сяргеем Мартынюком. Я хацеў гаварыць з ім аб паслядоўнасцях уваходу Польшчы ў Шэнгенскую зону, ды пачуў наступнае:

— Дый аб чым тут гаварыць. Пачніце вы і іншыя журналісты думаць што рабіць, каб палякі сталі вяртацца на радзіму, як іх заахвоціць, як стварыць ім адпаведныя ўмовы.

У сувязі са зменай ліку жыхароў, на Падляшшы (не ўлічаючы эміграцыю) у 2030 годзе сітуацыя мае быць крыху лепшая. У параўнанні з 2005 годам лік насельніцтва мае паменшаць на каля 80 тысяч з каля мільёна двухсот. Гэтыя ўсе з’явы паўплываюць на тое, што польскія палітычныя асяроддзі прабуюць брацца за дзеянні па іх спыненню, ды галоўным чынам з-за таго, што не будзе каму зарабляць на пенсіённыя фонды. Я сам маю чым турбавацца, бо ў 2030 годзе, прадбачаным ГСУ дэмаграфічна чорным, буду якраз напярэдадні пераходу на пенсію (калі, вядома, Гасподзь раней не вырашыць іначай).

Пры нагодзе, пэўна фінансавае заахвочванне зверху да нараджання, сярод гэтага і г.зв. „бэцікавае” з нагоды нараджэння дзіцяці ды падаткавыя льготы за дзяцей (хоць у варыянце прынятым парламентам гэтыя апошнія ахопяць багацейшых, якія менш ахвотна нараджаюць), мабыць, не будзе мець для іх большага значэння. Я не ведаю, ці такога тыпу імпульсы неяк вырашальна паўплываюць на перакананне народа да пракрэацыі. Цікавае таксама і тое як пытанне дэмаграфічнага спаду будзе адносіцца да нацыянальных меншасцей, галоўным чынам цікавіць мяне беларуская меншасць. Далікатна кажучы, сумна было б, каб гэтая з’ява далучылася да — як сцвярджаюць назіральнікі — самапаланізавання тутэйшых беларусаў. У гэтым кантэксце, дарэчы, ад даўжэйшага ўжо часу я поўны захаплення ад аднаго ўжо пажылога беларускага паэта, які разам з жонкай беларускага паходжання не толькі дачакаўся дачкі ў сваіх сталых гадах, дый яшчэ выхоўвае яе нацыянальна свядомай. На маю думку, гэтае сужонства — лепшы прыклад пераломвання апасенняў перад выдаваннем на свет патомства, чым урадава-парламентарныя інспірацыі ў гэтай справе. Мабыць, больш паспяховай з’яўляецца праца па ўсведамлянню не толькі пенсіённых паслядоўнасцей дэмаграфічнага крызісу, але таксама магчымай з’явы занікання, памяншання колькасці паасобных народаў, якія павінны складаць сям’ю супольнай Еўропы. Несумненна, датычыць гэта таксама нацыянальных меншасцей.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Сяброўскія дажынкі ў Студзянках

Ёсць такая вёска пад Беластокам, сем кіламетраў у правы бок Васількава. Студзянкі. Дваццаць дзве вуліцы, тысяча жыхароў. Сучасная школа на сто вучняў плюс вялікі дзіцячы сад. І дзяцей тут большае з году ў год. На адной Васількоўскай вуліцы (тры прыпынкі ПКС) амаль у кожнай хаце — прадпрыемства. Хто сталяр, хто каменшчык, хто кравец... — а кожны ахвотны спонсар мерапрыемства. „Зойдзеш спытацца, ці не пасобяць у арганізацыі, дык яшчэ рот не адчыніш, а ўжо абяцаюць" — кажа солтысіха Яўгенія. А ў Студзянках два салэцтвы, кіруюць імі дзве жанчыны — Яўгенія Гурко і Іаланта Шыманская, якая заняла пасаду першы раз.

— Як што, пытай пра Міраславу Бездзель, — сказала мне бабуля Лідзія Лазэўская, якую наведваю на пачатку вёскі, на вуліцы Спулдзельчай (яна сястра пяцёх братоў Хомкаў, пра якіх пісалі мы ў першым нумары „Нівы"). Бабуля, якой амаль 90 гадоў, не пойдзе сёння, 16 верасня, на вясковае мерапрыемства. Цяжка, ды і холадна. А Мірка, заснавальніца згуртавання Таварыства распаўсюджвання культуры, узніклага 13 гадоў таму — гонар усяе вёскі. Усё вакол яе круціцца. Мне прозвішча Міраславы Бездзель асацыюецца ўжо з дзейнасцю супрасльскага згуртавання Uroczysko.

— Я больш займаюся праграмнымі мерапрыемствамі, — кажа спадарыня Мірка, якую лаўлю, калі выходзіць „чорным ходам" з будынка пажарнага дэпо. — Сённяшняя імпрэза больш традыцыйная, народная. Тут непераўзыдзены нашы пані солтысіхі. Наша таварыства напісала Праект адновы вёскі, трэба было скласці план імпрэзаў. Стараліся вынайсці такія мерапрыемствы, каб настала ўвайшлі ў жыццё вёскі. У мінулым годзе сарганізавалі мы дажынкі, больш „дажынкавую бяседу". У нас ужо няма сапраўдных дажынак, бо толькі 144 гаспадары ў вёсцы, а такіх сапраўдных дык адно 3-4, з вялізнымі гаспадаркамі. Наша вёска вялікая, развіваецца. Патрабуем інтэграцыі, розных сустрэч, на якія людзі выйшлі б са сваіх хатаў. Нашы солтысіхі — вельмі энергічныя, вельмі па-жаноцку падыходзяць да справы, па-свойму. Дома культуры ў нас няма. Гэты будынак, пажарнае дэпо, мае месцы, у якіх сустракаюцца моладзь і старэйшыя. Адно з памяшканняў — асяроддзевая святліца. Мы стараемся, каб вёска была актыўная, хочам мяняць стэрэатыпы: каб людзі ведалі, што пры дэмакратыі кожны можа вырашаць пра свае справы. Заснавалі мы свой клуб, называецца „Twierdza", футбалістаў. Наша таварыства займаецца ўсімі аспектамі грамадскага жыцця — экалогіяй, культурай, грамадскай дзейнасцю, экалагічнай і рэгіянальнай адукацыяй дзяцей і моладзі. За гэтыя гады зрэалізавалі мы шмат праектаў пры падмозе Фонду падтрымкі вёскі, Польска-амерыканскага фонду свабоды. Гэта невялікія гранты, бо і мы маленькая арганізацыя, лакальная. Стараемся. У вёсцы маем дзіцячы ансамбль, „Пламеньчыкі", і фалькорны — „Мальвянкі". Наш дзіцячы садок падтрымліваюць Польска-амерыканскі фонд свабоды і Сусветны банк. Я з'яўляюся яшчэ раднай. Мы стараемся пераняць гэтае прадшколле на фінансаванне, пераканаць, што яно вельмі патрэбнае. Дзяцей у нас усё больш. Сёлета некаторым дзецям трэба было адмовіць, бо група не можа мець больш чым 14-15 асоб. Гэты садок выконвае сваю ролю: ён не апякунчы, а адукацыйны, па прынцыпах выраўнавання шанцаў. У вядзенні садка памагаюць бацькі, на занятках мусіць быць заўжды іх двое... Зноў прынялі мы ўдзел у пару конкурсах, трэба іх выйграць і брацца за работу. Кожная грамадскасць, якая яднаецца нейкім чынам, гэта файная справа, — кажа Міраслава Бездзель, якую ўжо атачаюць дзяўчаткі, распытваюць пра сваё выступленне. Бо ўжо пляц за дэпо, вельмі прыгожа прыўкрашаны пажніўнаму, запоўнены гледачамі розных узростаў.

Дажынкавы каравай прымаюць ад старастаў Іаланта Шыманская (першая справа) і Яўгенія Гурко

Міраслава Бездзель сярод дзяцей

— Праваслаўных і каталікоў у нас пароўну, — кажа солтысіха Іаланта Шыманская. — І цяпер няма ніякіх праблем. Я нядаўна стала солтысам. Раней супрацоўнічала з Міркай у згуртаванні. І неяк уключылася ў жыццё вёскі. Я з дзядоў-прадзедаў студзянская. І бачу, што вёска развіваецца. Дык трэба дакласціся да гэтага развою, кожны як умее. Каб не была гэта спальня Беластока.

Другая солтысіха, спадарыня Геня Гурко, не адну кадэнцыю трымае вясковую ўладу. Туліцца да яе ўнучка Дамініся, вучаніца.

— Ну, вядома, дзейнічаем. І вёска наша папулярная. Людзі купляюць пляцы, селяцца. Бо ж мы лічымся падгарадской зонай. Запрасілі мы бурмістра Васількава... Яшчэ не прыехаў... А вось гэтыя граматы — дык для нашых спонсараў. Васьмёра нас падтрымала. Былы радны нам памог, сталяр, ляснічы Раманюк, крамарка пані Бэата... Пані Жукоўская, стаўце калектывы, каб ішлі па чарзе...

Пачнуць святкаванне васількаўскія вучні з духавога аркестра. Аж насы гледачы павыцягвалі — маладзенькія красуні ў скупым адзенні з пампонамі, можа і дрыжачы ад холаду, вядуць дажынкавае шэсце. Спераду стараста са старасцінай з караваем — Міраслаў Шыманскі і Анна Трок, далей улады ды калектывы. Кідаюцца ў вочы вядомыя строі „Мальвянак" з Нінай Жукоўскай (выступалі м.інш. на Купаллі ў Залуках), спявачак з „Журавінак" з недалёкіх Агароднічак, ідуць „Падлясянкі" з Васількава, „Чарнавяцы", „Чорная ягада" з Чорнай-Беластоцкай і маладзенькія студзянскія „Пламеньчыкі". Па-беларуску заспяваюць і „Мальвянкі", а перш за ўсё, па-свойму пацягнуць „Журавінкі", ды найлепш гуляцца будзе пры свойскіх песнях ужо ў зале, калі на пляцы застанецца сама моладзь, якой не страшны будуць навіслыя над вёскай фіялетавыя хмары... Паблаславілі плёны святары — каталіцкі Тадэвуш Зайкоўскі ды Анатоль Гайдучэня са Свята-Петрапаўлаўскага прыхода. І пачаўся паказ — ад бадзёрага выступлення васількаўскай моладзі. Гэты духавы аркестр, дарэчы, аздабляе ўсе акалічныя мерапрыемствы і пачуць ды ўбачыць можна іх, напрыклад, і ў Гарадку.

„Журавінкі" з Агароднічак

— Мы хацелі б сарганізаваць штосьці такое, як гарадоцкая „Сяброўская бяседа", — кажа Ніна Жукоўская з калектыву „Мальвянкі", з якой мы сустракаліся ўжо і ў Залуках. — Мы самі ездзім ахвотна ў госці па розных беларускіх мерапрыемствах і запрашаем да сябе. Сёння, на жаль, не магла да нас прыехаць залучанская „Каліна", бо паехала на цэнтральныя агульнакраёвыя дажынкі. А „Калінцы" і „Каліначцы" ўжо, мабыць, гміна не магла даць транспарту... А мы так іх чакалі, асабліва меншыя гледачы. Мая ўнучка Анэта выступае ў „Пламеньчыках", ім было б так цікава пазнаёміцца... Ну, на такое штосьці як міжнародная „Сяброўская бяседа" вопыту ў нас яшчэ не хапае, ды можна браць прыклад. Бачыце, якія Залукі маленькія, з якой маленькай школкай, а ім удаецца. А нашы гаспадыні таксама моцныя! Гляньце, якую гасціну падрыхтавалі „Мальвянкі" і іншыя жанчыны. Тут трэба і ўяўлення, і таленту, не толькі кухарскага!

Найлепш гулялася, аднак, пры беларускіх песнях. У зале адкульсьці вынайшліся нават амаль дапатопныя кружэлкі „Дубіноў"! Рэй вялі запісы „Прымакоў". У танцы кінуліся ўлады ды спевакі. Шэсць агародніцкіх спявачак з-пад Супраслі ў сваіх беларускіх строях разам з сяброўкай, якая не магла выступаць па прычыне сямейнай бяды, перадавалі прывітанні чытачам „Нівы" і прасілі, каб іх не забывалі — і вясковыя калектывы, і беларускія таварыствы, і тэлебачанне ды перш за ўсё „Ніва": у чэрвені будучага года будзе ім трыццаць гадоў! Самі збіраюцца, самі спяваюць, шукаюць маладых для папаўнення гурту. З нейкай зайздрасцю паглядалі яны на студзянскіх самадзейнікаў. Пэўна, прыдалася б ім такая Мірка Бездзель (якая, дарэчы, дзейнічае не толькі ў сваёй вёсцы), прыдалося б нейкае заахвочанне ды падбадзёрванне збоку. А найлепш, вядома, мець сваіх гаспадарлівых людзей, які яне пашкадуюць грошыка на падтрымку, да якіх не трэба ісці з працягнутай рукой. І вёска не мусіць быць аж у 22 вуліцы, каб сабраўся тлум на мерапрыемстве.

Студзянкі — дзетная вёска

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Прыманка

28 жніўня рабіў я пакупкі ў прыватнай пякарні ў Гайнаўцы па вуліцы Белавежскай. Чарга была невялікая. Кліентамі займаліся дзве маладзенькія прадаўшчыцы. Да іх нечакана далучыўся рослы мужык пад вусам, які ўвайшоў ззаду ды, кінуўшы позіркам на чаргу, падаў кожнаму з пакупнікоў здобную халу. Хтосьці адазваўся: „Ды што гэта за нагода?". Але пытанне засталося без адказу. Можна здагадвацца, што быў гэта шэф пякарні, які вырашыў зрабіць пакупнікам сюрпрыз з нагоды праваслаўнага свята. Прыпамінаецца мне штосьці падобнае з Чаромхі, калі ў час адкрыцця крамы „Дукат" пакупнікам давалі дармовы бохан хлеба. Вось, даражэнькія, як зараз дбаюць пра кліента.

У рыначнай эканоміцы ажыццяўляецца лозунг „рэклама рычагом гандлю". У сродках масавай інфармацыі на гэта процьма доказаў. Пісьманосцы ўкідаюць у паштовыя скрыні рэкламныя буклеты, прадпрымальнікі ў маркетах ладзяць прамоцыі. А ўсё дзеля таго, каб зманіць чалавека. Ад чатырох гадоў не магу адчапіцца ад Люкас-Банка, які прапануе танныя крэдыты. Нягледзячы на гэта, што я не адказваю на іхныя пісьмовыя прапановы, назойліва тэлефануюць мне з Варшавы. Прызнаюся шчыра, што раз я зрабіў дурніцу, калі захацелася мне ў тэлегульні выйграць вялікія грошы. Зараз жа я зразумеў, што клюнуў на прыманку. Але, хто на гарачым апарыцца, той на халоднае дзьмухае. Так яно заўсёды з наіўнымі бывае.

Уладзімір СІДАРУК

Над возерам

8 верасня г.г. пры сонечным надвор'і на прыстані рыбаловаў-вудзільшчыкаў на беразе Семяноўскага вадасховішча аддалі ў карыстанне паветку-дашак са сталамі і лаўкамі. На пікніку сустрэліся будаўнічыя дашка. Пабудавалі яго ў хуткім тэмпе. У пачатку жніўня загаварылі пра патрэбу дашка і пляжа Славамір Кулеша (радны Нараўчанскай гміннай рады), Міраслаў Шыманюк і Юзаф Аліхвер. Будавалі павець у грамадскім пачыне, між іншым, Адрыян Шыманюк (солтыс), Радаслаў Матысюк (радны з Семяноўкі), Уладзімір Плева, Мікалай Грэсюк, Юзаф Дунец, Мікалай Скепка, Мікалай Панькоўскі, Міраслаў Шыманюк, Ян Аліхвер ды ініцыятары пабудовы.

Дошкі на паветку даў войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч, дубовыя слупкі — ляснічы Юрый Панькоўскі, кроквы і дошкі на сталы ды лавы — Міраслаў Шыманюк.

8 верасня на прыстані гарэла вогнішча і плылі беларускія песні, м.інш. „Ой, васількі, васількі", „Беларусачка", пра Галю, і пра рабінушку. Вальсы і іншыя мелодыі іграў на акардэоне Ян Лясота. Былі і тосты. Спраўляў тут свой дзень нараджэння Юрый Мацкевіч. Хапіла для ўсіх напіткаў і ежы. На агні смажылі вясковую саланіну і кілбаскі. Час праходзіў хутка і прыемна ў вясёлай кампаніі.

(мох)

Культура ў Міхалове

Размова з дырэктарам Гміннага асяродка культуры ў Міхалове Аннай ДАБРАВОЛЬСКАЙ.

— ***Якія мерапрыемствы ладзіць Ваш асяродак у гадавым маштабе?***

— Галоўным лічу Рэгату за Кубак зубра, якая сёлета адбылася 30 чэрвеня і 1 ліпеня на Семяноўскім вадасховішчы; мяркую, што прыцягнула яна каля дзевяці тысяч людзей.

У апошні уік-энд мая ладзілі мы Дні Міхалова, на якіх прысутнічала каля чатырохтысячная аўдыторыя.

У палове верасня ладзім Свята грыба, якое па сутнасці з'яўляецца фэстам гурманаў, бо з гэтай нагоды нашы кулінарныя майстры прэзентуюць сваё майстэрства.

Важным мерапрыемствам з'яўляецца Бандароўская гасцёўня, бо яе па сутнасці ладзіць тамашняе грамадства. Там вельмі актыўныя людзі, ініцыятыўныя, якія, для прыкладу, самі хадайнічаюць перад спонсарамі. Наш асяродак ім толькі дапамагае. Хачу падкрэсліць, што шмат працы ў карысць гэтага мерапрыемства ўносіць Валянціна Ласкевіч. Бандароўскую гасцёўню прымяркоўваем да Сяброўскай бяседы ў Гарадку, ладзячы яе за тыдзень да гарадоцкага мерапрыемства.

Чарговым па рангу мерапрыемствам з'яўляецца Гмінны Сільвестр 31 снежня, які збірае шмат народу з Міхалова, Гарадка і наваколля.

У студзені ўключаемся ў агульнапольскі Вялікі аркестр святочнай дапамогі, які ладзім тут, у нашым гмінным цэнтры.

3 мая і 11 лістапада арганізуем патрыятычныя святкаванні, 26 мая Дзень маці, 1 чэрвеня — Дзень дзіцяці. У лютым і сакавіку ладзілі мы спартыўныя спаборніцтвы. Першым быў сямейны турнір трохасабовых валейбольных каманд за кубак войта Міхалоўскай гміны, а другім — сямейны футбольны турнір, таксама за кубак нашага войта. У студзені арганізуем ёлку для дзяцей ды сустрэчы пенсіянераў у Міхалове і Ялоўцы. У навучальным годзе некалькі конкурсаў для дзяцей...

— ***А якія дзеянні праводзіце пастаянна?***

— Двойчы ў тыдзень праводзяць заняткі члены Клуба асоб залатой восені, які ў нас налічвае каля трыццаці асоб. Столькі збіраюць танцавальныя заняткі; на мастацкія прыходзіць пад дзесяць чалавек.

Практыкаванні шахматнага гуртка наведвае шаснаццаць асоб, ткацтвам займаецца шасцёра чалавек. Пластычныя заняткі наведвае дваццаць чатыры малечы, у гітарным коле займаецца сем асоб. У Новай Волі хацелі мы навучаць англійскай мове, але не было на гэта ахвотных.

Дарэчы, жыхары Новай Волі не адгукнуліся зацікаўленнем на нашы ініцыятывы ў іх адрас, каб разгарнуць там культурную дзейнасць. А вось у Саколі, дзе за справу ўзялася бойкая Агнешка Тарасюк-Сутрык, узнік дынамічны культурны асяродак, якому мы далі вольную волю ў прапанаванні культурных праектаў. Вось летам адбыўся там канцэрт, якога зоркай быў „Oddział Zamknięty"; настрой канцэрта неардынарны: спеў у палявых умовах на сцэне сярод лесу!

— ***У якіх мясцовасцях гміны працуюць вясковыя святліцы?***

— Круглагадова ў чатырох вёсках: Новай Волі, Ялоўцы, Геранімове і Бандарах, а ў перыяд канікул яшчэ і ў Саколі. І тут зноў з сумам мушу заўважыць, што найменш зацікаўлены святліцай нававольцы. Затое ў Геранімове наведвае яе каля сарака дзяцей! Сакрэт гэтай шматлюднасці ў тым, што ў Геранімове шмат дзяцей з г.зв. паталагічных сем'яў, якія ў святліцы маюць магчымасць не толькі нечым карысным заняцца, але і пакарыстацца адсутнымі ў іх такімі здабыткамі як лазенька з душам.

— ***А якія мастацкія калектывы дзейнічаюць пад шырмай Вашага асяродка?***

— У нашым асяродку дзейнічаюць два гурты сучаснага танца: маладзёжны „De Facto" і дзіцячы „Mini De Facto". Працуе тэатральная група. Дзейнічаюць тры вакальныя калектывы: маладзёжны „Singers", які выконвае песні з рэпертуару Доды, дзіцячы „Gok-Art" і дзіцяча-маладзёжны „Kres", які спявае беларускія песні. Маем таксама тры вакальна-інструментальныя калектывы: гэта мужчынскі дуэт „Капэла" з Ялоўкі, маладзёжны ансамбль „Schody", які выконвае рок-музыку, ды эстрадная група дарослых „Тройка".

— ***У якіх аб'ектах працуе Ваша ўстанова?***

— Большасць мерапрыемстваў адбываецца ў будынку нашага асяродка з глядзельнай залай. Аднак у найбліжэйшы час рыхтуемся да яго грунтоўнага рамонту, які ўжо патрэбны здаўна; магчыма, што на той час нашу дзейнасць будзем весці ў нашых школах.

Сёлета быў адрамантаваны будынак святліцы ў Геранімове. У Саколі думаем тамашнюю святліцу пераўтварыць у Народны дом — асяродак творчай працы з канферэнц-залай, гасцінными пакоямі, сацыяльным адсекам і нават пракатам веласіпедаў. Зацікаўленне турызмам расце, таму і ў нас трэба гэтай з'яве выходзіць насустрач і думаць не толькі пра начлегі і веласіпеды, але таксама пра чартэр яхтаў на Семяноўскім вадаёме.

І ўсё трэба рыхтавацца да новых выклікаў, рыхтаваць на курсах нашых працаўнікоў. Яны вельмі заангажаваныя, ініцыятыўныя. Прыкладам тут згаданая ўжо Агнешка Тарасюк-Сутрык ці Марцін Сякерка, які спаборнічаў са мной у конкурсе на пасаду дырэктара нашага асяродка. Яго праекты мне вельмі спадабаліся і я запрапанавала яму супрацоўніцтва і да гэтай прапановы ён паставіўся вельмі станоўча. Супрацоўнічае з намі Цэзары Мелька. Таксама ўдалося мне прыцягнуць да супрацоўніцтва Ілону Карпюк — гэта сапраўдная жамчужына, якая іскрыцца ініцыятывамі; яна можа нават гэтага яшчэ не ўсведамляе.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Таксама стараемся падтрымліваць ініцыятывы насельніцтва. Вось, для прыкладу, у адказ на заангажаванне жыхароў Бандароў у арганізацыю Бандароўскай гасцёўні пабудуем там сцэну — краевугольны камень ужо закапаны. Бо Гасцёўня набірае размаху, сёлета сцэну ўпрыгожвала жніўная карціна Пётра Гагана. У Міхалове паўстане амфітэатр — побач плавальнага басейна.

— ***Ці Ваша ўстанова шэфствуе культурным або іншым помнікам на тэрыторыі Вашай гміны?***

— Гэтым займаецца Гмінная ўправа, у коле нашых дзеянняў у гэтым напрамку толькі прыцягванне да веласіпедных паходаў.

— ***З якімі ўстановамі супрацоўнічае Ваш асяродак?***

— Вельмі добра складваецца ў нас супрацоўніцтва паміж гміннымі ўстановамі, напрыклад, рыхтаваць Рэгату многа нам дапамагла наша Управа камунальнай гаспадаркі. Варта згадаць і пра пажарнікаў, і пра прадшколле, якое забяспечыла Рэгату кулінарыяй, дапамагалі таксама прыватныя асобы. У гмінныя, у тым ліку і ў нашы, мерапрыемствы вельмі ангажуецца наш войт, які лічыць, што гміна павінна быць адзіным арганізмам.

Супрацоўнічаем з Яхт-клубам „Korab" з Беластока, які пасля Рэгаты наладзіў курсы для нашай моладзі.

У гміне ёсць і мясцовыя старэйшыя арганізацыі, але яны пакуль без лідэраў, і быццам папалі ў стан гібернацыі.

Супрацоўнічаем таксама з хорам Універсітэта ў Беластоку — я сама спявала з тым хорам, наведала з ім семнаццаць краін. І пра сябе пры нагодзе крыху скажу. Я да прыходу ў Гмінны асяродак культуры працавала ў школе, закончыўшы дзве спецыяльнасці педагагічных штудыяў. Але ў школе я адчувала сябе прыгнечанай, і ўжо стала баяцца, што гэтая прыгнечанасць выліецца ў нейкую агрэсію, што я стану прыдзірлівай настаўніцай; я марыла пра ўзнёслае. Прыйшоўшы сюды на пасаду я сутыкнулася з новымі выклікамі, новымі патрабаваннямі і здабыла чарговую адукацыю — менеджэра культуры ў варшаўскай Галоўнай гандлёвай школе.

Супрацоўнічаем і з Мазурскай выратавальнай службай у Акартове каля Ожыша. Яны, пакуль, займаюцца ў нас аховай некаторых мерапрыемстваў на Семяноўцы, пакінулі нам шмат абсталявання, м.інш. судна і ў нас узнікае шанс арганізаваць сваю водна-выратавальную службу.

У працы вялікую ўвагу прысвячаю арганізацыі работы. На кожнае наша мерапрыемства галоўным адказным вызначаны адзін працаўнік. Для прыкладу, у час Рэгатаў госці дзівіваліся, што кожнаму з іх загадзя было вызначана канкрэтнае месца — такое ў нас нячаста бывае.

— ***Сардэчна дзякую за размову.***

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

У сукнях бароніхі ў Геранімове

У Геранімова заязджаем пад вечар. Сіман Дыкерт, спецыяліст па касмічных справах ды атмасферных з'явах ды больш прыземных — гандлі нерухомасцямі, адразу бачыць нябачнае: тут, у падміхалоўскай вёсачцы, найлепш было б заснаваць абсерваторыю па назіранні за касмічнымі аб'ектамі. Бо цішыня, чыстае паветра... Толькі, узняўшы вочы направа — водсвет ад Беластока; гэта ад забруджанага паветра, што ўздымаецца над сталіцай рэгіёна. Ды пакінулі мы сталіцу разам з яе каштоўнасцямі і брудным паветрам.

Тут так ціха. І людзі, мабыць, такія — заглыбленыя ў сваю драмлівую прыроду. Ды мне ўспамінаецца гісторыя аднаго вядомага гайнаўскага лекара, які працаваў быў тут недалёка; ехаў сюды на матацыкле з Юшкавага Груда на ратунак, а падвыпіўшыя тады геранімоўцы ўздумалі загуляць: паміж дрэвамі развалаклі сталёвы трос. Гэтая жартоўная гульня кончылася доктару ў бальніцы, ды і не толькі яму. У той час працавала тут калектыўная дзяржаўная гаспадарка, хлопцы сталі дзядзькамі — або зусім з'ехалі з глузду ад непрабуднай п'янкі, або з'ехалі з гэтага свету. Бо бачым у цьмяным святле пару фанароў кабет і дзяцей, што круцяцца паміж руінамі ды прыбудоўкамі, якія ад поўнага ўпадку ратуе фанера і дошкі, папрыбіваныя як папала, паміж дапатопнымі „таксоўкамі" з павыкручванымі буферамі ды матацыклетамі, раскірэчанымі на пяску. Бабуля, якой можа і не будзе 60 гадоў, сядзіць пад плоцікам і махае рукою: няма чаго яе пра нішто пытацца. Махае рукой у бок дзвюх новых руін — там стаяць шэрыя блёкі. У адным з іх не паселіцца ўжо ніхто. Шэрая „вялікая пліта" зеўрае вялізнымі пустымі вачыскамі вакон і шырокіх балконаў. У той бок — направа — паміж лабузіннем у рост чалавека вядзе сцежка, пры якой гараць кітайскія каляровыя лампіёны. У другі бок — асветленая быццам каляровымі светлякамі — у цёмны парк, дзе высока развешаны на аграмадных дрэвах, якім будзе пару соцень гадоў — шнуры з лямпачкамі. А далей — на сажалцы, стаіць лодка, на якой, як парусіны, ярка свецяцца быццам развешаныя на вешаках сукні-палотны. Ад лодкі далятае бурчанне матора, ад якога ідзе электраток на асвятленне казачнага антуражу, так як і ў „блёку", у якім трэба ўзбірацца па крывой лесвіцы, каб убачыць тэлевізар. На экране там тутэйшыя дзяўчаты шыюць багатыя сукенкі. А на сцяне хтосьці накрэмзаў: NASZA WIOCHA JEST DOBRA.

— Ідэальнае месца на касмічную абсерваторыю, — нязменна шчыра ўсміхаецца сваім старазаконным тварам Сіман, які звычайна назірае за космасам і прыроднымі з'явамі пад Звяркамі.

Сіман не прапускае ні адной вартай увагі падзеі і на зямлі, асабліва культурнай. І здымае ўсё вартае ўвагі. Ён і ўцешыўся, што тут, апрача цішыні і цікавага краявіду, будзе штосьці новае. Гэта мастачка Агнешка Тарасюк-Сутрык, што пасялілася непадалёк, непаседлівая аніматарка культуры, не першы раз у Міхалоўскай гміне разварушвае людзей. Яе дзеянні бачаць ва ўсёй Польшчы, узнагароджваюць яе, ды гэтая таленавітая і сціплая асоба, някідкая на выгляд, не думае пра лаўры. Справа ў тым, каб зварухнуць людзей будучых у маразме, апусціўшых рукі, каб кінулі спячку, пашукалі прыгожага. Ці то ўпрыгожыўшы ўласны падворак, ці павыцягаўшы бабуліны і свае скарбы з куфра, ці ўзяўшы ў рукі пэндзаль, фотаапарат ці звычайны кручок. І ў пакінутай Богам і людзьмі запушчанай вёсцы каб не шукалі гуляў, крыўдзячых іншых. Прыгожае ратуе чалавечнасць.

— Геранімова — тыповая вёска. Яна цяпер на нашым баку, ды магла б быць і на беларускім. Гэта месца, якое магло б быць такой „крэсавай" гісторыяй у пігулцы, — кажа Агнешка Тарасюк. — Быў тут двор у васемнаццатым стагоддзі, класіцыстычны палац. Мянаў ён уласнікаў за сваё жыццё. Апошняй уладальніцай у дваццатыя гады мінулага стагоддзя была бароніха Вольга Рам. Была тут вельмі добра дзейнічаючая вялікая гаспадарка, вінна-гарэлачны і крухмальны заводы, класіцыстычны, добраўпарадкаваны парк з алейкамі. Праваліліся па гэтай тэрыторыі войны, акупацыі. Пасля тут была калектыўная дзяржаўная гаспадарка. Пасля таго ўсяго засталіся руіны. І цудоўны краявід. Вельмі добра прадуманая архітэктура. Будынкі ўзнесены на пагорку, усюды доўгія відокавыя восі... Проста, сімвалічнае месца. Ужо адно прывезці сюды людзей і паказаць гэты скарб — пазітыўнае дзеянне. Мне 36 гадоў, і памятаю, што такі ПГР быў сінонімам негаспадарлівасці, пасляпэгеэраўскія вёскі — сінонімам забыцця, апушчэння і грамадскай дэградацыі. Ды, „грабучыся" ў гэтым месцы, дашукалася я добрых успамінаў людзей аб гэтым этапе гісторыі, незрэалізаваных, ды вельмі шляхетных грамадскіх намераў. А ўсё запісана ў краявідзе і ў матэрыі. Тое, на што мы запрасілі сёння людзей, разыгрываецца ў двух месцах — дзвюх руінах, што стаяць насупраць адна адной...

Ядром праекта Агнешкі ў Геранімове было шыццё сукняў. „Як шылі сукні бароніхі". Успамінаецца бароніха, якая жыла тут 70 гадоў таму, і была элегантнай дамай у стылі саракавых гадоў. Ды асацыяцыя з „сукняй бароніхі" маецца зусім не з саракавых гадоў, а цалкам у стылі барока, казачным, ды на сам лозунг геранімоўскія дзяўчаты пачалі размалёўваць амаль казачнае адзенне — сукні вузенькія ў таліі, з крыналінам, як у Марыі-Антаніны. І пашылі тыя сукні. Яны рэалізавалі свае мары пра прыгожае. Каб адчуць сябе, дзяўчат з пасляпэгеэраўскай вёскі, прыгожымі, шляхетнымі. І каб прыйшлі людзі на свята, каб паразмаўляць пра былое, паслухаць музыку сапраўднага камернага аркестра, папіць гарбаты з парцаляны, налітай з музейнага самавара.

Гэта не нейкае прадстаўленне, а перформенс. Ніхто тут нікім не прытвараецца. Кожны сам сабою — ці паненкі на траве ў багатых сукнях, ці дзядзькі, што ледзь вылезлі з гумафільцаў, ці беластоцкія госці. Дзеці пабеглі ў руіны — шукаць нейкую бестыю. Знайшлі: пад навіслым муром склепа пішчаць дзве „бестыі"-шчанючкі сучкі, што жыве пасярод развалін класіцыстычнага палаца. А гэты дзень належыць дзяўчаткам, што ў пашытых уласнымі рукамі бліскучых сукнях прахаджваюцца па парку ды разам з іншай моладдзю і дзецьмі гайдаюцца на арэлях.

Ці мае сэнс такі перформенс пасярод развалін?

— Я заўжды ставіла перад сабою пытанне пра сэнсоўнасць мастацтва, і яго камунікатыўнасць, — усміхаецца Агнешка Тарасюк. — І такія сітуацыі з пазагалерэйнай, пазасеціўнай культурай. Мяне цікавіць рэакцыя людзей, якія не маюць доступу да такога „паняццевага апарату" і не датычыць іх „мода" на такога тыпу справы.

Канчаецца перформенс. Музыкі збіраюць свае інструменты. Гаснуць лампіёны. Зіхацяць быццам зоркі шнуры лямпачак у парку, ад жа дрэмлючай на тоні вады лодкі. Не зварухнецца ані адзін лісточак. З-за руін выройваюцца новыя гледачы: — No, dawać nam tu disco-polo!

Ад чорных палеткаў нясецца свойскі густы пах.

— Не ведаеш? Тут наўкола адкормліваюць гусей. Кругом іх — мільёны! — здаецца, перабольшвае Сіман. І зноў глядзіць у неба.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

У Белавежы

Улады не рэагуюць на крытыку

Быў я ў Белавежы (Гайнаўскі павет) у пачатку чэрвеня г.г. і напісаў у „Ніву" крытычныя заметкі пра тамашнія тратуары, пра дашкі і лавачкі на прыпынках аўтобусаў ПКС, пра небяспечныя ўхабіны ў маставой па вул. Вашкевіча ды іншыя непаладкі на вуліцах.

Зноў я з'ездзіў і пахадзіў па белавежскіх вуліцах 23 жніўня г.г. Убачыў, што за гэты час нічога не змянілася на лепшае. А ў чэрвені я заходзіў да войта і да сакратара Гміннай управы ў Белавежы і гаварыў, што — па-мойму ды на думку жыхароў гэтай пушчанскай вёскі — неабходна аднавіць і добраўпарадкаваць. І ўсе мы былі згодны: трэба ўзяцца і ліквідаваць непаладкі.

Перш-наперш тратуар няроўны амаль на 3-кіламетровым адрэзку павятовай вул. Вашкевіча (ад царквы да касцёла і яшчэ далей да дому састарэлых). Ходзяць на прагулку курортнікі ды старэйшыя людзі і зачапляюцца за зруйнаваныя, сям-там раструшчаныя пліткі тратуара на гэтай галоўнай вуліцы.

23 жніўня г.г. ішлі па вул. Вашкевіча два пажылыя мужчыны. Адзін з іх зачапіўся за выстаючы край тратуарнай пліткі і мала бракавала а распластаўся б. Ён і сказаў уголас: „Ты, Валодзя, паглядзі, у Белавежы горшыя ходнікі чымсьці ў нас, у Чыжах".

Так вось праз два а то ўжо і трэці на зыходзе месяцы ў Белавежы нічога не рамантавалі. На аўтобусных прыпынках не аднавілі дашкоў і не памалявалі лавачак. Ніхто не наводзіць парадку на аўтобусным прыпынку каля касцёла. Тут дзіравы дашак, пад лавачкамі, даўно не маляванымі, ляжаць бутэлькі і рознае смецце.

Гмінныя ўлады не клапоцяцца пра маставую вуліцы Вашкевіча. Яна не мае вадасцёкавай каналізацыі, а вада робіць сваё: падмывае і разбурае асфальтнае палатно па яго краях. Не пішуць заяваў у Павятовае староства ў Гайнаўцы пра ўхабіны ў асфальце, якія трэба ліквідаваць, каб было бяспечней ездзіць. А і самі маглі б пашукаць нейкага выхаду.

Пісаў я пра недахопы ў белавежскай вулічнай інфраструктуры, а эфект такі: як гарохам аб сцяну. І ў галаву прыходзіць назойлівая думка: чаму мясцовыя ўлады, у тым ліку нававыбраны войт, мала клапоцяцца дзеля таго, каб белавежцам лепш жылося. А гэтыя ж нават дробныя непаладкі бачаць таксама замежныя і айчынныя турысты. Многа іх прыязджае ў славутую Белавежскую пушчу. Шмат іх зараз, летам, таксама на белавежскіх вуліцах. Які вобраз Белавежы астанецца ў іх памяці?

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Фота Міры Лукшы

Дажынкі ў Гарадку

Лясное возера

Хараство якое
Возера лясное —
Не пазнаць зусім,
Стала раніцай
Возера лясное
Залатым.
Свае жалудочкі
Скінулі дубочкі,
А рабіны — гронкі,
Што гараць як зоркі...
Бярозы-дзяўчынкі
Лісце-залацінкі,
Як прамень зары —
Возера, бяры!
Возера лясное —
Вада залатая,
Хараство такое
Восенню бывае.

Яўген КРУПЕНКА

Моладзь змагаецца за прыроду

Ці патрэбныя нам акцыі прыбірання зямлі?

— Вядома, патрэбныя! — кажа дашкольнік Тамаш. — А чаму? Бо ад паперкаў і смецця паміраюць звяркі: вожыкі, жабы, сланы, гіпапатамы...

Тамаш упершыню выйшаў з сябрамі прыбіраць наваколле. Праўда, дашкольнікі мелі ўпарадкаваць адно пляц гульняў каля свайго прадшколля. Тут валялася крыху паперкаў і пластмасавых прадметаў. І невядома адкуль яны ўзяліся на іх пляцы. Хіба раскінулі іх старэйшыя хлапчукі, якія пасля поўдня прыходзяць сюды гуляць у мяч. А можа навеяў вецер? Бо сучасны дашкольнік ведае, што нельга смецце кідаць пад ногі, што кожную непатрэбную, выкарыстаную рэч ці прадмет трэба прыбраць, пасартаваць у асобныя кучкі і занесці ў спецыяльныя сметніцы.

Старэйшыя дзеці і моладзь пайшлі прыбіраць лес.

— Я ўсё яшчэ ў шоку, — кажа гімназістка Эля. — Усё старое і нямоднае людзі вязуць і выкідаюць у лес. У ямках мы сустракалі фатэлі, тэлевізары, гаршкі, лядоўні. Амаль гадзіну мы патрацілі, каб вывалачы лядоўню з ямы. І яшчэ мая сябоўка скалечыла сабе палец, — успамінае расхваляваная Эля.

Гімназістка прымае ўдзел у згаданай акцыі з часоў дзіцячага садка. Кажа, што такія дзеянні дапамагаюць адно маладым, якія час ад часу задумаюцца пра патрэбу аховы прыроды. Бо калі ідзе пра дарослых — а гэта менавіта яны выгружаюць непатрэбшчыну ў лес — няма паправы. Наадварот, з году ў год вакол нас смецця ўсё больш і больш!

ЗОРКА

Фота Ганны Кандрацюк

ГІСТОРЫЯ ПРА СМС, ЯКІХ ПРОСТА ЧАКАЮЦЬ

...О, як свяціліся вочкі Адэлькі ў той самы дзень, калі яна раптам адчула!.., калі ейнае сэрцайка заспявала самую шчымлівую песню з усіх, якія толькі можна пачуць на свеце! І спявалася тая песенька для прыгожага, самавітага хлапчыны Валерыка. Для Валерыка, які быў побач, які быў блізка; так блізка, што ядналі іх у той дзень нясмелыя дотыкі гарачых рук, адчайныя сполахі глыбокіх поглядаў, незабыўная слодыч спапяляючых пацалункаў.

Але ўсё заканчваецца. Закончыўся і той дзень, адгарэла спатканне, і паспыталі на смак Валерык з Адэлькаю хвілю крыху сумнага развітання. Моўчкі глядзела дзяўчына на хлопца, моўчкі дала запісаць нумар свайго мабільнага тэлефона.

— Я прышлю... — упэўнена дзякаваў за тое Валерык.

— Буду чакаць. І ейныя вочы па-ранейшаму свяціліся; свяціліся толькі яму аднаму.

Увесь вечар, можна сказаць, неадрыўна глядзела на свой мабільнічак дзеўчынёха. Так і заснула з ім у руцэ. Праўда, яшчэ ноччу..., разы з два ці тры... Аднак... дарэмна. Дарэмна, дарэмна, дарэмна.

Калі прыйшоў Валерык, Адэлька ўжо не спала. Яна сядзела на лавачцы, яна, канешне, радасна і ветліва яго сустрэла, вось толькі ейныя вочы — ейныя прыгожыя, глыбокія, немагчыма сінечныя вочы — не свяціліся болей.

— Што здарылася? — як быццам нешта адчуў Валерык. Толькі дзяўчынка — яна проста яму ўсміхалася.

„Што здарылася? Што здарылася? Што здарылася?" — дарэмна спрабаваў зазірнуць у самую сутнасць дзявочых вачэй. Але яна яму — толькі ўсміхалася, усміхалася, усміхалася.

Але!.. На шчасце, на вялікае шчасце, Адэлька — пачула. Яна пачула, усё пачула. Хоць маўчаў ужо хлопец, маўчала дзяўчына.

Пачуў і Валерык. І з той самай хвілі — зноў сонейкам свяціліся толькі яму аднаму бясконца прыгожыя, немагчыма сінечныя дзявочыя вочы. І з таго самага дня, кожным-кажнюткім вечарам, атрымлівала яна самыя добрыя, самыя цёплыя і такія чаканыя смс на мабільны свой тэлефончык.

Ваш Дзядзечка Сід
12 верасня 2007 г., Кобрын

ТУТЭЙШЫЯ ЗАМАЛЁЎКІ

Ідэальны Марцэль



Майго героя ў сапраўднасці завуць Вайцехам, аднак я і мае сяброўкі, рашылі перахрысціць яго Марцэлем. У яго чорныя, доўгія, простыя валасы, ён высокага росту і мае прыгожы, далікатны твар. Мы дайшлі да высновы, што маладзён, які напамінае матыля, не можа называцца Вайцехам. Гэтае імя, быццам бы, зацяжкае для яго. Ну і мы прыдумалі яму новае імя-мянушку: Марцэль!

Мы асабіста незнаёмыя з хлопцам... Аднак здараюцца дні, калі мы з Лёляй і Ганкай бесперапынна аб ім гаворым. Першы раз сустрэлі яго паўгода таму, на рок-канцэрце. Мы *закрунулі* яго ў танец *пога* і гэта яму спадабалася. Марцэль увесь час ачароўваў нас сваёй праменістай усмешкай. Якраз і тады запамятаўся яго воблік, які не хацеў знікнуць з галавы. На шчасце свет — малы. На другі дзень мы даведаліся, што наш матылёк-прыгажун, гэта сябра нашага сябры, скейта Паўла.

— Гавары ўсё што пра яго ведаеш! — загадалі мы Паўлу.

— Не ведаю... ці варта, — астудзіў наш запал хлапец.

— Ты хіба жартуеш, — здзівіліся мы, — чаму так гаворыш?

— Ваш Марцэль мае дзяўчыну, — сказаў Паўл, — але справа ў чым іншым....

— Пра што ты гаворыш?

— Каб вы ведалі які ваш Марцэль... нахабнік і *дамскі* баксёр!

— Не можа быць! — абурылася Лёля. — Лепш скажы ў чым справа. Што ён такое зрабіў?

— Ён вельмі груба ставіцца да сваёй дзяўчыны, ды называе яе такімі словамі, што брыдка паўтараць...

Мы з Ганкай і Лёляй былі ў шоку. Не маглі паверыць у тое, што сказаў Паўл.

— Ён не такі! — не пагаджалася адна Лёля. — Я не веру ў тыя байкі...

На шчасце, пасля двух дзён, мы даведаліся, што Паўл памыліў нашага Марцэля з нейкім Крукам. Мы акрыялі і павесялелі.

— І так ведаю вашага героя, — сказаў Паўл. — Гэта той, што катаецца на роліках разам са скейтамі. І скажу вам яшчэ — ён сябруе з найгоршым вучнем у школе.

— Значыць, і Марцэль тупіца? — спытала я.

— А як ты думаеш? — глянуў на мяне Паўл.

Папраўдзе, я не ведала што думаць. Толькі адна Лёля не здавалася:

— Не-не-не! Я не веру ў гэтыя словы! Хопіць зірнуць на яго далікатны, уражлівы твар.

Марцэль, як высветлілася пазней, добра закрунуў нам у галовах. Напрыканцы школьнага года я сустрэла нашага *матылька* на горадзе і так узрушылася, што памыліла аўтобусы і села ў іншы чым трэба...

Пасля былі канікулы, час, калі ўсе забываюцца аб усіх. Праўда, наша тройка не забылася пра Марцэля. Аб ім напамінала нам песня польскага гурту „Aya rl" — „Шкура". Мы вырашылі, што гэта будзе гімн Марцэля.

І добра! Цяпер мы ходзім сабе па школе і голасна спяваем гэтую цудоўную песеньку.

— Адкуль вы ведаеце такія старыя песні? — пытаюць нас настаўнікі.

Гэтай песні больш за 20 гадоў. Я не гавару, што песню знайшла ў бацькавым камп'ютэры.

Так ці інакш гімн не дазваляе нам забыцца пра Марцэля. Апошнім часам да нас дайшла новая вестка. У гэты раз пра Марцэля распавяла найлепшая сяброўка *матылька*.

— Ваш ідэал на пасведчанні меў сярэднюю ацэнку 6,00, — сказала дзяўчына.

— Што?! — крыкнулі мы з Ганкай.

— А я адна з вас заўсёды верыла, што ён ідэал! — затрыумфавала Лёля.

Мы з Ганкай нічога не сказалі, бо спадзяемся, што яшчэ не адно пачуем пра нашага ідэальнага героя.

<Natasza9922@wp.pl>
<Lolcia05@tlen.p>

Вершы Віктара Шведа

Рэкламуюць пагоду

Сыночак, замест крыху павучыцца,
У тэлебачанні глядзіць праграму.
Да тэлевізара ён раптам кліча
Працавітую надзвычай маму.

— Хадзі хутчэй матуля дарагая,
Цябе цікавіць гэтае заўсёды.
У тэлевізары за хвілю пачынаюць
Рэкламаваць нашую пагоду.

Сіямскія каты

— Дарагая Марыя,
Ці ведаеш ты,
Адкуль у вас такія
Прыгожыя каты?

— Гэта каты панскія,
Яны сіямскія.
— А скажы мне, Марыля,
Як вы іх раздзялілі?

ГАЛЕРЭЯ ДЭКЛАМАТАРАЎ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Моніка Баравік — Гайнаўка

Марта Матысюк — Нараўка

Польска-беларуская крыжаванка № 38



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 34: Стог, шар, амур, зыск, лапа, рыба, смех, кальцо, рака, ядун, агарак, сок, я, загадка. Рака, пазыка, рыбак, сала, ток, ара, сцяг, мода, але, рад, махіна, суп, рапс.

Узнагароду, **кашульку з „Зоркай"**, выйграў **Адам Цыванюк** з Беластока. Віншуем!

Памяці рыцараў Аршанскае бітвы

Жыццё народа неразрыўна злучанае з дзеямі мінулага, якія стварылі сённяшні дзень і памяць — тую неразрыўную нітку, звязаўшую нацыю ў цэласць і далучыўшай да агульначалавечага быцця.

Але памяць народа, яго дзеі, якія ўпісаны залатымі літарамі ў старонках яго жыцця, зачастую застаюцца не толькі забытымі, але адмыслова выкрэсленымі і выдаленымі з быцця той ці іншай нацыі.

Так сталася з беларусамі. Гісторыя і дзеі іх зямлі перадусім невядомыя ім самім. Змяняючыеся адна за адной акупацыйныя ўлады спрабуюць разарваць звязваючую ў суцэльнасць нітку-памяць, каб раскідаць нацыю па кавалках і пасля са спакойным сумленнем прыпісаць іх да сябе. І, на жаль, гэта адбываецца і сёння — у XXI стагоддзі цывілізаванага дэмакратычнага свету, які не стаў на абарону пакрыўджанай нацыі, а заняў пазіцыю чакання...

І таму яскравы прыклад — падзеі 8 верасня 1514 г., калі войскі Вялікага княства Літоўскага на чале з Кастусём Астрожскім у бітве пад Оршай перамаглі раці Маскоўскага княства.

Так. У самой Беларусі забаронена не толькі гэтае свята, але і магчымасць яго адзначаць і прапагандаваць. З нацыянальнай памяці выціраюцца самыя лепшыя і самыя яскравыя моманты. І сёння Таварыства беларускай культуры ў Літве, выправіўшыся ў вандроўку па былых этнічных беларускіх землях, адзначала не толькі гэтае свята, але зазначыла ўсяму цывілізаванаму свету аб яго існасці.

Раніцай, 9 верасня, сябры ТБК, на чале з яго старшынёй Хведарам Нюнькам выправіліся ў вандроўку, якая стала трэцяй па ліку за гэты год, каб аддаць павагу забытым героям Аршанскай перамогі.

Мы праехалі па тых рэгіёнах, вядомых не толькі сваёй гісторыяй і знакамітымі асобамі, але і тых, што і сёння тут яшчэ размаўляюць на беларускай мове, але ўжо, згубіўшы сваю нацыянальную самаідэнтыфікацыю, думаюць, што яны палякі. Вось адзін з прыкладаў таго, што, згубіўшы нацыянальную свядомасць, чалавек ужо не суадносіць сябе са сваімі каранямі і продкамі. І гэта сведчыць аб тым, наколькі важна яе не толькі захоўваць, але і фармаваць.

Першым нашым прыпынкам былі Яшуны. Тут захаваліся (праўда, у занядбаным стане) сядзіба Балінскіх і Снядэцкіх ды ў надзвычай цудоўным стане сямейныя могільнікі. Гэты род даў шмат навуковых і культурных дзеячаў. Сярод іх Ян Снядэцкі — рэктар Віленскага універсітэта, прафесар астраноміі, фізікі і матэматыкі, Міхал Балінскі — гісторык, Ян Балінскі — прафесар псіхалогіі Пецярбургскай вайсковай акадэміі.

Помнік Кастусю Каліноўскаму ў Салечніках

На мяжы між Літвою і Беларуссю

Затым мы спыніліся ў Салечніках і наведалі помнік Кастусю Каліноўскаму — кіраўніку паўстання 1863-1864 гг., які быў адкрыты ў верасні 1999 г., а таксама літоўскую гімназію тысячагоддзя Літвы, якая ў гэтым годзе адзначыла сваё дзесяцігоддзе. Гледзячы на яе, толькі зайздросціш літоўцам, наколькі яны ўмеюць і могуць думаць аб фармаванні нацыянальна свядомай літоўскай моладзі.

І вось мы ўсё бліжэй і бліжэй да афіцыйнай беларускай граніцы, бачым памежную агароджу, якая падыходзіць да самой дарогі, раздзяляючы нябачнай, але неперасягальнай мяжой тыя народы, што больш за тысячагоддзі жылі разам, мелі супольную гісторыю і дзяржаву. Але гэта было...

Прыехаўшы ў Дзевянішкі, адразу вухам схопліваеш тую мову, на якой размаўляюць мясцовыя. Праўда, як згадвалася вышэй, яны не лічаць сябе беларусамі, за рэдкімі выключэннямі. Маючы літоўскія прозвішчы, размаўляючы па-беларуску, яны ўсімі праўдамі і няпраўдамі даказваюць, што самі яны чыстыя палякі, такія як і ў Варшаве. Але ўзнікае пытанне — калі вы палякі, то чаму не размаўляеце па-польску, чаму цалкам адсутнічае польскі фальклор, польскія традыцыі, а калі і спяваюць польскія народныя песні, то яны зусім не з гэтага рэгіёна.

Самым цікавым і плённым у нашай вандроўцы было наведванне Нарвялішак. Мы ў другі раз змаглі быць і ля самой мяжы з Беларуссю і адчуць духам, што мы знаходзімся на сваёй этнічнай бацькаўшчыне. Якраз народ збіраўся на нядзельную імшу. І нас у чарговы раз уразіла іх беларуская мова. І тут адчуўся чарговы боль — мяжа, што раздзяліла гэты рэгіён. Па той бок агароджы мы бачым людзей, што прыйшлі таксама на нядзельную імшу, але патрапіць у касцёл яны не могуць, бо ён за плотам, які сёння аддзяліў іх ад таго, што было для іх часткай жыцця, светаўспрымання. Бо як яны не могуць хадзіць па той зямлі, у якую ўраслі, якую стапталі сваімі нагамі. Тут і могільнік, дзе спачываюць іх родныя і блізкія — а яны практычна не могуць іх наведаць. І так не могуць зразумець, што здарылася такое, што яны сёння там і не могуць патрапіць. Вось адна бабулька скардзіцца, што нават не змагла патрапіць на пахаванне сваёй роднай сястры. Бо так не пускаюць, а афармленне візы патрабуе часу — гэтулькі часу нябожчыцу ніхто не будзе трымаць у хаце.

І тут нас чакала невялікая прыемнасць. Прыехаўшы мясцовы ксёндз (літовец па нацыянальнасці) надзвычай прыязна да нас паставіўся. Нават прамовіў некалькі слоў на беларускай мове і, праспяваўшы калядку „Сёння ў Бэтлеем, сёння ў Бэтлеем, дзіўная навіна, Святая Панна, Святая Панна, нарадзіла Сына", сказаў, што быў асабіста знаёмы з беларускім ксяндзом Уладыславам Чарняўскім. І дадаў, што сапраўды мясцовыя парафіяне варожа ставяцца не толькі да беларускай мовы ў касцёле, але і да літоўскай. На прапанову праспяваць беларускі гімн „Магутны Божа" паставіўся станоўча сябра ТБК Андрусь Старавойтаў. Праўда, сам ксёндз баяўся рэакцыі парафіянаў, і нават прадугледжваў такі варыянт, што бабулькі могуць выйсці з касцёла ў часе гучання спеву. Але і на наша здзіўленне, і ксяндза ім не толькі спадабалася гучанне гімна, але ў канцы яны аддзячылі гучным воплескам апладысментаў.

І напрыканцы мы наведалі знакаміты Нарвялішскі замак, які жыве пятым жыццём. Аб яго гісторыі нам распавёў мясцовы супрацоўнік, апрануты ў адзенне манаха. Пабудова замка звязана з каханнем, калі маладая пара пажадала жыць разам у адным месцы, пасля тут быў кляштар францысканцаў, зачынены расійскімі ўладамі ў 1831 г. за ўдзел манахаў у паўстанні. Пасля тут была створана расійская ваенная база, пасля жаночае вучылішча і вось зараз, пятае жыццё — гатэль.

Так заканчвалася наша вандроўка, прысвечаная рыцарам, што палеглі на Аршанскім полі, баронячы незалежнасць свае зямлі. Яны аддавалі ўласныя жыцці, жадаючы бачыць веліч свае бацькаўшчыны, яе незалежнасць, яе існасць як еўрапейскай дзяржавы.

Мова, якая гучала з іх вуснаў, калі яны каналі пасля цяжкіх раненняў, яшчэ жыве, але іх надзеі аб вольнасці іх святое зямлі так і не збыліся. Яна сёння акупавана тымі, каго яны перамаглі тады, пяць стагоддзяў назад.

І нам сорамна перад іх памяццю. Але наша жыццё, тое, што мы іх узгадалі — сведчанне таго, што іх кроў не была дарэмнай, што іх мары аб незалежнай Беларусі збудуцца.

Перад касцёлам — сярод вернікаў

Вільня, 9 верасня 2007 г.

Алесь АДАМКОВІЧ

Фота Язэпа РУСАКЕВІЧА

Палова веку без вайны

Rex fit, dux nascitur (Каралём становішся, князем нараджаешся)

Паўстагоддзе, калі ў Вялікім княстве Літоўскім не было вайны, гэта час княжання Казіміра Ягелончыка з 1440 г. па 1492 г. Унікальны і непаўторны выпадак у гісторыі нашай краіны. Але не толькі з гэтай нагоды варта ўспомніць гэтага вялікага князя. У 2007 г. спаўняецца некалькі юбілейных дат, звязаных з яго жыццём і дзейнасцю.

Кракаў. Вавель. Гатычны кафедральны сабор XIV ст. Магільны склеп польскіх каралёў, епіскапаў, самых слаўных дзеячоў нацыянальнай гісторыі. Колькі тут беларусаў-літвінаў? Галоўны ўваход заходняй фасады вавельскай кафедры. Ад поўдня прыбудавана капліца св. Крыжа, размаляваная ў візантыйска-беларускім стылі. Насупраць уваходу насценны роспіс адлюстроўвае Апошні Суд. На фоне роспісу дзве грабніцы. З аднаго боку шыкоўная грабніца караля і вялікага князя Казіміра Ягелончыка, заказаная яшчэ пры яго жыцці ў Фейта Штоса, з другога — скромная яго жонкі Альжбеты Габсбургскай, маці каралёў. Каля бацькоў спачываюць памерлыя ў дзяцінстве дзве дачкі Альжбеты. У гэтай капліцы, пабудаванай на сродкі Казіміра Ягелончыка, спачывае і яго маці Соф'я Гальшанская, заснавальніца роду Ягелонаў. Ахвяравальны надпіс на беларускай мове абвяшчае, што капліца ўпрыгожана роспісам па загадзе „многамагутнага караля прасветлага Казіміра, з Божае ласкі караля Польшчы, вялікага князя літоўскага і рускага, і жмудскага, і князя прускага, і нашчадка etc. уладара многіх зямель і яго каралевы найяснейшай пані Альжбеты з пакалення ракушскага, унучкі непераможнага кесара Жыгімонта (...) у годзе ад нараджэння Божага 1470". Ужо з гэтай нагоды, што ў вавельскай кафедры па загадзе польскага караля зроблены надпіс на *беларускай мове*, варта ўспомніць аб гэтым незвычайным чалавеку з незвычайным лёсам.

Сын Ягайлы і Соф'і Гальшанскай нарадзіўся 30 лістапада 1427 г., роўна 580 год таму, у Кракаве. Ці ведаў хто, які лёс наканаваны гэтаму хлопчыку, унуку знакамітага вялікага князя Альгерда, вызваліцеля Украіны ад татарскага ярма, у гонар якога прысвечаны 2007 год? Можа параўнанне некарэктнае, але яму на працягу 52 гадоў прыйдзецца весці „сеанс адначасовай гульні на многіх дошках", або „гуляць у валейбол аднаму супраць многіх каманд на некалькіх пляцоўках з некалькімі мячамі, не дазволіць ні аднаму мячу ўпасці на яго пляцоўку". Гэта зусім не гульня ў хакей аднаму на пустым полі.

Пасля смерці Вітаўта і Ягайлы ў Вялікім княстве Літоўскім пачалося ваеннае змаганне княска-баярскіх партый, ачоленых Свідрыгайлам — братам Ягайлы і Жыгімонтам Кейстутавічам — братам Вітаўта. Вайна ішла з пераменным поспехам пакуль 20 сакавіка 1440 г. не быў забіты Жыгімонт Кейстутавіч у выніку замаху віленскага і троцкага ваяводаў — Даўгірда і Лелюша ды князя Чартарыйскага. Цяпер сын забітага, Міхалюшка, называў сябе вялікім князем, як і Свідрыгайла. Групоўка Яна Гаштольда шукала выйсця перад пагрозай падзелу Літвы, якая знаходзілася паміж дзвюма небяспекамі: саперніцтвам паноў і польскай экспансіяй. Выйсце было знойдзена. У канцы траўня 1440 г. Казімір, як намеснік караля Польшчы Уладыслава, адбыў у Літву, а з ім 2 000 польскіх рыцараў. Прыйшлося ўсю світу добра ўпаіць і раніцай, калі ўсе палякі спалі, 29 чэрвеня 1440 г. у віленскай кафедры Казімір быў аб'яўлены вялікім князем Вялікага княства Літоўскага. У выніку віртуознага ходу быў аб'яўлены суверэнітэт ВКЛ і забяспечаны кампраміс з Польшчай. На думку літоўскага прафесара Эдвардаса Гудавічуса, „прайшоўшае школу Вітаўта малодшае пакаленне яго сучаснікаў выканала мінімальную з пазначаных ім праграм. (...) у апошні момант успелі ўскочыць на прыступку ўцякаючага еўрапейскага экспрэса". Так пачаўся час 13-гадовага Казіміра Ягелончыка.

Малалетні Ягелончык, прыбыўшы з чужыны, навучыўся беларускай мове, засвоіў беларускія традыцыі, прыняў свядомасць беларускага манарха. Усё жыццё ён падкрэсліваў, што з'яўляецца нашчадкам справы яго вялікага дзядзькі Вітаўта.

Стаўшы гаспадаром Вялікага княства Літоўскага, Казімір Ягелончык і яго апекуны на чале з троцкім ваяводам Янам Гаштольдам заняліся аб'яднаннем дзяржавы, якую трэслі амбіцыі і памкненні магнатаў да самастойнасці, нават да стварэння новай дзяржавы на адарваных землях. Адбылося некалькі замахаў на Казіміра, але Гаштольд быў пільны. Неўзабаве „пцянец выляцеў з гнязда". Шляхам дамоў і прывілеяў Казіміру Ягелончыку ўдалося трымаць нязменнымі межы ўплыву Вялікага княства ажно да вытокаў Волгі і вярхоўяў Акі на працягу ўсяго яго кіравання. Смаленцам выдаў ён устаўную грамату, падобныя прывілеі і аўтаномію даў Жамойці, вярнуў Кіеўскую зямлю князю Алельку, на Валыні ўтварыў удзельнае княства старога Свідрыгайлы з пажыццёвым тытулам вялікага князя, заключыў пагадненні з Псковам, Ноўгарадам і Цвярскім княствам, потым з Масквой. Дзе трэба ён садзіў сваіх намеснікаў, а землям-анексам выдаваў устаўныя граматы на самакіраванне. Асабліва важным для ўнутранай кансалідацыі была прывілея ад 1447 г., з якой практычна бярэ пачатак парламентарызм у Вялікім княстве (яшчэ адзін юбілей: 560 год пачатку парламентарызму на Беларусі).

Тое, што было потым згублена і не можа ніяк быць адноўлена да цяперашняга часу ў галіне падпарадкавання Праваслаўнай царквы, з поспехам зрабіў Казімір Ягелончык. Яму ўдалося адмежавацца ад Маскоўскай мітраполіі і мець „свайго" праваслаўнага мітрапаліта. Казімір увёў выбары мітрапаліта на царкоўных саборах толькі з ліку мясцовых епіскапаў. Ён дасягнуў галоўнай мэты — аўтаноміі Праваслаўнай царквы ў ВКЛ. Напэўна прымаў у гэтым удзел „Александр Солтан, кавалер або рыцар Святога Гробу и Золотого Руна, подскарбий надворный Великого Князства Литовского, который от короля Казимира Ягеллона тые Жыровицы за службу держал". Так, гэта той самы Аляксандр Солтан, якому пастушкі прынеслі цудоўны абразок Маці Божай, заснавальнік Жыровіцкага Свята-Успенскага манастыра. Ён стагоддзем раней за Мікалая Крыштафа Радзівіла наведаў Святую Зямлю, наведваў папу Паўла II і папу Сікста IV. Магчыма недзе ляжаць запісы яго падарожжаў і чакаюць свайго даследчыка.

Падтрыманы Казімірам Ягелончыкам славянскі першадрукар Швайпольт Фіёль арганізаваў першую ў свеце друкарню кірылічнага шрыфту. У выпушчаным ім „Часаслове" ёсць тэкст: „Докончана быс сия книга у великомъ граде оу Кракове при державе великаго короля польскаго Казимира и докончана быс мещанином краковъскымъ Шваиполтомъ Фиоль из немец немецкого родоу Франкъ. Искончашас бо Божием нарожениемъ 14сътъ девяць десят 1 лето" (г.зн. у 1491). Францыск Скарына праз гадоў 12-14 у час вучобы ў Кракаве напэўна трымаў у руках гэтую кнігу і ці не яна дала штуршок першадрукарскаму подзвігу Францыска.

У 2008 г. споўніцца 540 гадоў з таго часу як з'явіўся першы з вядомых збораў беларускага феадальнага права. Статут Казіміра Ягелончыка быў зацверджаны 29 лютага 1468 г. у Вільні на нарадзе вялікага князя з панамі-радаю ды „з усім паспольствам". Яшчэ яго называюць „беларускім статутам", бо напісаны на беларускай мове і ўвабраў у сябе нормы беларускага звычаёвага права. Статут Казіміра ў будучым арганічна завяршыўся стварэннем Статута Вялікага княства Літоўскага — найбольш дасканалым зборам законаў у Еўропе.

Невядома як склаўся б лёс Вялікага княства пад кіраўніцтвам Казіміра Ягелончыка, каб у 1444 г. пад Варнаю ў бітве з туркамі не знік бясследна кароль Польшчы, 20-гадовы старэйшы брат Казіміра, Уладыслаў. У кастрычніку ў Гродна прыбыла дэлегацыя польскай кароннай рады з прапановай Казіміру прыняць тытул выбарнага польскага караля. Але літоўскія паны-рада прапанавалі кампраміс: Казімір можа быць суверэнным правіцелем Літвы і вотчыннай Польшчы. Карацей, прапаноўвалася персанальная унія суверэнных краін. 25 чэрвеня 1447 г. (560 гадоў таму) у Кракаве адбылася каранацыя. Умовы палітычнай гульні сталі больш складанымі. Цяпер Казімір нёс адказнасць яшчэ за адну краіну. І ў абоіх краінах палітыка Казіміра выклікала незадаволенасць пануючых груповак: Яна Гаштольда ў Літве і Збігнева Аляснiцкага ў Польшчы. Калі ў Літве быў мір, то Польшча распачала 13-гадовую вайну з Тэўтонскім ордэнам, за што ў 1457 г. Казімір Ягелончык быў адлучаны ад Касцёла рымскім папам. Але атрымаў ён перамогу ў вайне і ў выніку Торуньскага міру ў 1466 г. Польшча атрымала выхад да Балтыйскага мора. Сталіцу Крыжацкага ордэна перанеслі ў Крулявец, а вялікі магістр быў абавязаны прысягаць польскаму каралю. Збіранне польскіх зямель у Казіміра адбывалася з вялікім поспехам. Але каралю трэба было вырашаць яшчэ дынастычныя сямейныя праблемы. Ад шлюбу з Альжбетай Габсбургскай Казімір займеў 6 сыноў. Уладыслаў стаў каралём Чэхіі і Венгрыі, Ян Альбрэхт — каралём Польшчы, Аляксандр і Жыгімонт — вялікімі князямі ВКЛ і каралямі Польшчы, Казімір прызнаны святым, апекуном зямель ВКЛ і моладзі, патронам Гродзенскага біскупства (асобная служба ў яго гонар праводзіцца 4 сакавіка), Фрыдэрык стаў кардыналам. Меў Казімір яшчэ і 7 дачок (Ядвіга, Соф'я, Альжбета, другая Альжбета, Ганна, Барбара і наймалодшая Альжбета, бо дзве папярэднія памерлі ў дзяцінстве). Князёўны пашлюбавалі высокіх асоб, так што падобна ўсе еўрапейскія манархі маюць сярод сваіх продкаў патомкаў з роду Казіміра Ягелончыка.

Дзейнасць Казіміра Ягелончыка мела і мае многа праціўнікаў. Яго абвінавачваюць у многіх недальнабачных дзеях. У 1481 г. незадаволенасць вылілася ў бунт удзельных князёў. Слуцкі князь Міхаіл Алелькавіч і Хведар Бельскі, а таксама Юры Гальшанскі ды Іван Глінскі падрыхтавалі замах на гаспадара. Аднак змоўшчыкаў выкрылі. Гальшанскага ды Алелькавіча схапілі і пакаралі смерцю, а Бельскі з Глінскім уцяклі ў Маскву. Адны з яго чынаў прылічваюць да велічных дасягненняў, другія — недальнабачнымі альбо нават згубнымі. Але застаецца фактам, што Казімір Ягелончык паўстагоддзя вёў бітвы не толькі па ўсім перыметры свайго гаспадарства, але і ўнутры яго. Толькі гэтыя бітвы былі слоўныя, а не ваенныя. Так, Літва не змагла ацаніць змен у татарскім свеце і павінна была выбіраць паміж Вялікай Ардой і Крымам ды ўверавала ў 1480 г. у перамогу Ахмета на Угры. Ды не ўдалося ваяваць чужымі рукамі, а свае былі занятыя: надта ажывіліся туркі ля Днястра на паўднёвых граніцах. Не было перашкод Турцыі і Маскве распаўсюджваць свой уплыў на тэрыторыях жыццёва важных для Літвы і былі пахаваны астаткі літоўскага ўплыву на Русь. Але з другога боку, мірная палітыка з Масквой, добрасуседства з Ноўгарадам і Псковам дазволілі адкрыць шлях для гандлю з Еўропай. Трэба ўлічваць і тое, што былі часы, калі небяспека з Польшчы была галоўнай палітычнай праблемай.

Уладарства Ягелонаў здавалася надзвычайным феноменам. Пад уплывам Ягелонаў пад канец жыцця Казіміра знаходзілася агромная тэрыторыя: Польшча, Літва (Жамойць, Беларусь), Чэхія, Венгрыя, Русь (Украіна). Займалі яны тэрыторыю ад Дзвіны на поўначы да Адрыятыкі і Савы на поўдні і ад верхняй Волгі на ўсходзе па Чэшскі Лес на захадзе. Дамініканін Ян Вунсхелберг з Амберга лічыў нават, што Ягелоны будуць кіраўнікамі ў дзеях направы свету і дасягнення „спакою Божага на зямлі".

Вялікае княства Літоўскае з розных этнасаў і канфесій ступіла на шлях развіцця адзінага саслоўнага грамадства. Толькі такое грамадства магло выстаяць перад ціскам Польшчы і знайсці ў яе падтрымку супраць набіраючай сілу Маскоўскай дзяржавы. Іван III, унук Вітаўта, ужо распачаў неаб'яўленную вайну і толькі чакаў спрыяльнага моманту.

За сто гадоў кіравання Казімір, яго дзядзька і бацька развярнулі Літву ў бок Захаду. А паколькі далей на ўсход былі візантыйская і ісламская цывілізацыі, Літве наканавана была роля бастыёна заходняй цывілізацыі.

7 верасня 1492 г. у Гродне памёр Казімір Ягелончык. Дата смерці супала з вялікім адкрыццём Хрыстафора Калумба і капітуляцыяй Гранадскага эмірата. Усходнюю частку Цэнтральнай Еўропы з поўдня і ўсходу стала сціскаць дуга візантыйскай і ісламскай цывілізацый.

Лявон КАРПОВІЧ

Апошнім часам існуе даволі папулярнае меркаванне нібыта беларуская нацыя па-сапраўднаму фармуецца толькі зараз. Меркаванне падаецца дзіўным, бо, па-першае, на фармаванне кожнай нацыі патрабуецца можа і не адно стагоддзе, з таго заўважыць і акрэсліць гэты перыяд могуць хіба наступныя пакаленні гісторыкаў, а па-другое, ці можа так хутка „новая" беларуская нацыя забыць пра „старыя" свае чыннікі — беларускую мову, гісторыю ці постацей культуры, на творах якіх вырасла не адно пакаленне беларусаў.

Тым не менш, паколькі сучасны момант у беларускім дзяржаўным развіцці застаецца вельмі няпэўным, нягледзячы на сякую-такую карысць ад існавання самастойнай дзяржавы для кіруючай эліты, у кагосьці ўзнікаюць думкі аб вартасці ўсталявання (ці, як яны кажуць, адраджэння) манархіі ў Беларусі. Думка даволі неардынарная, тым больш у наш час, калі манархі ў той жа Еўропе засталіся нечым накшталт сямейнай рэліквіі, але, пэўна, яна мае права на існаванне. Таму пазнаёмімся з ёй бліжэй, зазірнуўшы на сайт, які так і называецца „Манархія" і месціцца па адрасе ў Інтэрнэце http://www.manarchija.org.

Першая старонка „манархічнага" сайта зроблена проста, але адносна неардынарна. Яна падзеленая на дзве часткі, большая з якіх — левая — змяшчае ў сабе амаль усю інфармацыю, якую нам хацелі прадставіць распрацоўшчыкі. Тут і вітанне, і сацыялагічнае апытанне, і расповед аб прынцыпах і сімвалах, і яшчэ шмат чаго.

Калі ў цікаўнага інтэрнэт-карыстальніка ўзнікае пытанне „якая такая манархія можа быць у Беларусі?", са словамі вітання яму распавядаецца аб тым, што для гэтай краіны існаванне пад манархічнымі парадкамі не ёсць нечым новым і незвычайным. „За апошняе тысячагоддзе на беларускіх землях зьмянілася шмат розных дзяржаўных утварэньняў: славянскія княствы, Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая, Расейская Імпэрыя... Гэта былі вельмі розныя дзяржавы, але адна рыса была ўласьцівая ім усім і да XX ст. заставалася нязьменнай: манархічны лад на базе традыцыйных каштоўнасьцяў, — робяць экскурс у гісторыю беларускія манархісты. — Такім чынам, беларускі народ быў выгадаваны манархіяй у традыцыйным духу. Але ў XX ст. на нашых землях запанавалі сучасныя хваробы чалавецтва: бязбожжа, камунізм, нацыяналізм і г.д. І нават дагэтуль «прагрэсыўныя» дзеячы імкнуцца перакруціць гісторыю, зьнішчыць рэшткі шляхетнае традыцыі, ператварыць манархічную памяць народа на дзіцячыя казкі... Сайт «Манархія» створаны дзеля асьветы і абуджэньня гістарычнае памяці беларусаў, дзеля распаўсюду ідэі адраджэньня манархіі. Не падлягае сумневу, што нават простае пашырэньне манархічных ідэяў дапаможа беларусу пачувацца годна і шляхетна ў сям'і эўрапейскіх народаў".

Выйсці на рубрыкі сайта месцяцца зверху і знізу выяўлення. Іх змест даволі цікавы. Так старонка „У свеце" распавядае пра сучасныя еўрапейскія манархіі і спробы ўстанаўлення манархічнага кіравання. Рубрыка „Гісторыя" дае вялікую падборку тэкстаў па шляхецкай культуры і парадках мінулых гадоў. У „Спасылках" мы знойдзем роднасныя па духу сайты манархічнай накіраванасці з цэлай Еўропы.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

20 галоў за матч!

Асноўнай тэмай чарговага спартовага выпуску задумваўся аналіз футбольнага матча Славенія — Беларусь. Беларускае тэлебачанне не змагло арганізаваць трансляцыю першага тайма, за што яму трэба быць удзячным. Удзячным за тое, што не давялося мучыцца над назіраннем таго відовішча, які называўся футболам. Хапіла па вушы і пакутніцкага прагляду другога тайма. Да слова, давялося пабачыць у гэты дзень яшчэ два матчы: Францыя — Шатландыя і Англія — Расія. Змест гэтых гульняў выглядаў іншапланетным у параўнанні са славенска-беларускай пародыяй на футбол. Так што аналізаваць няма чаго, толькі для тых, хто не ведае зыходу, паведамім, што Славенія выйграла 1:0, забіўшы ў самым пачатку з пенальці, а Беларусь у сваёй групе апусцілася на ганебнае 6-е месца.

Звернемся лепш да гандбольных спраў. Тым больш, што беларускія мужчынскія клубы ўдала распачалі сезон. У першым кваліфікацыйным раундзе Кубка кубкаў мінскі СКА пад кіраўніцтвам мэтра Спартака Мірановіча адолеў чэшскі „Гумарны зубржы". У стартавым паядынку на сваёй пляцоўцы армейцы выйгралі 38:31. Асноўнай ударнай сілай у іх шэрагах з'яўляецца Барыс Пухоўскі. У гэтай сустрэчы ён закінуў у браму суперніка ажно 20 (!) галоў, што стала абсалютным бамбардырскім рэкордам за ўсю гісторыю айчыннага гандбола. У гасцявым матчы Пухоўскі забіў яшчэ 12 галоў, а СКА, хоць і саступіў 31:33, па суме дзвюх сустрэч упэўнена выйшаў у другі раунд. Дзеля таго, каб аформіць пропуск у асноўную сетку Кубка кубкаў, мінчанам трэба прайсці харвацкі „Карловац".

А цяперашні флагман беларускага гандбола — брэсцкі клуб імя Мяшкова чацвёрты год запар прабіўся праз кваліфікацыю ў групавую стадыю Лігі чэмпіёнаў. На гэтым шляху чэмпіёны краіны двойчы разграмілі сербскую „Црвену звезду" з Бялграда — 33:25 і 38:28. Заўважым, што па згодзе апанентаў, абодва матчы прайшлі ў Брэсце. Цяпер „мяшкоўцы" будуць гуляць у міні-турніры з удзелам чатырох каманд. Такіх квартэтаў усяго восем. Чарговымі супернікамі брэсцкага клуба стануць венгерскі „Пік", славенскі „Гарэнье" і баснійская „Босна". З лёсаваннем беларусам пашанцавала — у іншых групах ёсць куды мацнейшыя каманды. Яшчэ адзін наш еўрадэлегат мінская „Вікторыя-Рэгія" стартуе ў Кубку ЕГФ з другога кваліфікацыйнага этапу — яна сустрэнецца з турэцкім „Бешыкташам".

Пераможны пачын хлопцаў падтрымалі і беларускія дзяўчаты. Сталічная каманда з груваcткай назвай БНТУ-БЕЛАЗ на італьянскім востраве Сардзінія ў пульцы з чатырох камандаў змагла зачапіцца за другое месца, якое дало права прадоўжыць выступ у Лізе чэмпіёнаў. У другім раундзе супернікамі мінчанак, якіх трэніруе Канстанцін Шарабараў, будуць румынская, нарвежская і партугальская каманды.

Умацаванне фінансавай базы і пэўныя поспехі беларускага ручнога мяча апошняга часу многія звязваюць з кіраваннем гандбольнай федэрацыяй Уладзімірам Канаплёвым, уплывовым чыноўнікам і блізкім сябрам Аляксандра Лукашэнкі. Але днямі Канаплёў падаў у адстаўку з пасады старшыні адной з палат парламента. Паглядзім, якія наступствы гэты крок можа мець для гандбола.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Нацыянальнасць — жамчужына тваёй душы

Нацыянальнасць — тэма, якая „пералівалася" цераз усе эпохі — і ў літаратуры, і ў штодзённым жыцці. Пра яе проста немагчыма забыць, паколькі яна нам часта спадарожнічае. Гэта таксама пытанне, якое паўтараецца на ўроках беларускай мовы, але і не толькі там! Яно жыве ў табе: твая нацыянальнасць — гэты ты...

„Мы тут, у Германіі, зусім іншыя людзі", — чула я ўжо не ведаю колькі разоў у Гамбургу. „Справа ў душы народа", — гаварылі і палякі, і рускія, і грэкі... Развіваючы гэтую тэму трэба сказаць, што ўнутранасць кожнага з нас мяняецца ў той час, калі апынемся самі сярод іншай культуры, ментальнасці. Перамена прыходзіць сама і нават на пачатку яе не заўважаем. Проста — асімілюемся з культурай нацыі, краю, у якім прыйшлося нам жыць. Гэта зусім натуральны працэс: прымаем шмат што для нас новае, што карэнным чынам уплывае на нашу перамену. І так, напрыклад, грэкі ўжо тут так многа не святкуюць, іх тэмперамент мімавольна ахаладзіў клімат; палякам, якія тут доўга жывуць, нельга давяраць; туркі стварылі сабе свой Істамбул і некаторыя, жывучы па-за мяжой свайго краю нават дзесяць гадоў, так і не навучыліся гаварыць (не ўспамінаючы ўжо пра пісанне) на новай ім мове...

Не ўсіх можна аднак укідаць у адзін і гэты ж самы мяшок. Ёсць і выключэнні. Аднак, якая большасць нас тут, такая і думка... Нягледзячы на тое, што я жыву ў Гамбургу адносна нядоўга — гэта ўсё бачу. Дастаткова назіраць на вуліцы. Нават не трэба быць моцна звязаным з асяроддзем чужаземцаў. Здараюцца аднак і іншыя крайнасці. Напрыклад, адна са знаёмых сем'яў з Польшчы родам, якая тут жыве каля 20-ці гадоў, наогул разгубілася. Бацькі, калі пасяліліся ў Нямеччыне, забаранілі сваім дзецям гаварыць на польскай мове. Ад бацькі гэтай сям'і некалькі месяцаў таму пачула я такое выказванне: „Я ніколі не быў і не буду палякам! Я наогул ніколі з гэтай краінай нічога супольнага не меў!" Так... Толькі дзе гэты чалавек нарадзіўся, правёў не толькі дзяцінства, але таксама маладосць і частку дарослага жыцця? Ці забыў ён дзе жаніўся, дзе нарадзіліся яго дзеці? Калі такое чуеш, думаеш: „Ты і не паляк, і не немец. Ты НІХТО!" Гэта адносіцца да людзей усіх нацыянальнасцей.

Думаю, што кожны з нас павінен ведаць хто ён. Прыведзенае выказванне сведчыць толькі пра закамплексаванасць, пра гэта, што чалавек разгубіўся. Адначасова гэта баліць. Яшчэ больш, калі ты з гэтай самай краіны. І калі бачны ўсе недахопы, якія часта выраслі з комплексаў свайго народа на чужыне, стараешся ўсімі сваімі сіламі не быць ТАКІМ.

Людзі, якія пакідаюць сваё роднае старонне, не могуць забыць пра сваё паходжанне, адначасова паважаючы культуру і людзей іншага народа. Шанаваць — значыць, калі ты рашыўся выехаць не толькі на некалькі тыдняў, а на даўжэйшы час — трэба пазнаць мову гэтага краю. Паважаць — абазначае таксама не ўваходзіць у ботах у чужую нацыянальнасць, шанаваць традыцыю, людзей, іх спосаб бачання свету, іх праблемы.

Чытаеш гэтае і думаеш: „Гэта так, зразумела..." Так... Вядомае... Аднак чаму людзі становяцца іншымі, як самі часта пра сябе гавораць, за мяжой? Гэта застаўляе задумацца...

Здараецца і так, што некаторыя хочуць скрыць адкуль яны, аднак іх вымаўленне, якога не так проста пазбыцца, зараз жа адказвае нам на пытанне пра паходжанне. Шкада, што многія з нас не разумеюць, што ў нашай нацыянальнасці сіла! Адкуль мы — гэта нашае багацце, наша індывідуальнасць, адна з жамчужын душы, пра якую нельга ніколі забыць. Багацце, якім смела можам падзяліцца з іншымі, багацце, якое нічога не каштуе і адначасова вызначае нам нашу вартасць.

З уласнага вопыту ведаю, што калі я бліжэй пазнавала людзей, тым больш пытанняў яны мне задавалі. Чым больш праўдзівых інфармацый ад мяне атрымоўвалі, тым больш цікавіліся. Час ад часу здаралася адчуваць сябе нейкім экзатычным экземплярам. Напрыклад, Польшча і праваслаўе, беларускі ліцэй?! Як гэта магчыма? Некаторыя ўвогуле не ведалі чым праваслаўе розніцца ад каталіцызму. Іншыя хацелі як найбольш ведаць пра як жа „экзатычны" ліцэй, а пасля пра нашу культуру, абрады, музыку, беларускія стравы... Адным словам пра ЎСЁ... Трэба было ім усё гэтае тлумачыць, што ў Польшчы жыве многа нацыянальных меншасцей, што яны актыўныя (ствараюць свае арганізацыі, школы, адзначаюць народныя святы) і так далей.

Падсумоўваючы, яшчэ раз паўтару: не можам забыць ніколі ХТО мы, адкуль і ўвогуле не саромецца свайго Я — гэтага ў чым мы выраслі. Наша культура — наша нябачнае багацце, якога ніхто ніколі не зможа пералічыць на грошы. Не трэба выязджаць за мяжу, каб гэта ацаніць належным чынам. Шануйма гэта таксама і ў родным старонні! Якімі мы будзем — такая будзе карціна ўсяго народа...

А ці ты, чытач, без хвіліны сумнення адкажаш на пытанне пра сваю нацыянальнасць?..

Патрыцыя КОС, Гамбург

1 ☞працяг

Жыццё як у рэзервацыі?

у якіх будынках жывуць.

Некаторых турбуе мова. Адным падабаецца англійская, другім лягчэй было б па-руску. Галоўнае аднак, што калі ў будучыні сябры з Канады пахваляцца сваёй племяннной мовай, тады і нашы дзеці паганарацца сваёй, як сказала Марыся, мовай „па-просту”.

Не толькі дзяўчаты прымалі ўдзел у гульні ў фотарэпарцёраў. Пані Аліцыя рашуча шукае Данеля Буйко, аўтара шматлікіх здымкаў з жыцця Новай Волі. Так як дзяўчынкі прэзентуюць свой свет, так і Данель паказвае свой. Бачыць ён часам намнога больш, чым іншыя. Пра сябе расказвае неахвотна. Гэтак бывае з мастацкімі душамі.

Выстаўку сустракалі таксама мясцовыя жыхары. Дакладна выслухалі яны расказаў у ходзе адкрыцця, затым не менш дакладна аглядалі здымкі.

Праект па сваёй задуме мае пазітыўнае, вясёлае, а нават бестурботнае вымярэнне, але агляд нававольскага наваколля на здымках у Інтэрнэце прывёў індзейцаў да высновы, якая разбуджае зусім іншыя пачуцці. У адным з віртуальных лістоў сябры з-за акіяна параўналі падляшскую вёску да рэзервацыі, у якой яны самі жывуць. У жыхароў Новай Волі выклікае гэта смех. Але гэта не жыццярадасны смех, але такі, што нясе з сабой неспакой. І можа з аднаго боку гэта



— Я тут бачу вялікі кантраст. Цяжка нас параўноўваць, можа з іншай еўрапейскай краінай так, але з індзейцамі хутчэй за ўсё не, гэта зусім іншы свет, — кажа нам Ніна Буйко

не дзіўна — нашы падляшскія вёскі, праваслаўныя ці беларускія, маюць сваю адметнасць і можа гэта проста было бачнае на дзіцячых здымках. Яны глядзяць інакш, чым дарослыя. Хаця ніхто не бароніць выязджаць з вёсак, купляць зямлю, рабіць па-свойму, то ў свеце Еўрапейскага Саюза не часта здараецца сустрэць каня на полі ці аўтакраму, якая рэгулярна прыязджае ў вёску. Чамусьці ў нашы вёскі прыязджаюць і турысты са свету, шукаюць іншага, для іх забытага... Можа мы не адчуваем гэтага ў такі спосаб, таму і паяўляецца незадавальненне, а нават і голас пратэсту. Але лепш падумаць пра гэта як пра розныя вымярэнні свабоды. Яе рамкі вызначае культурны вопыт ды гады, праведзеныя з людзьмі, якія нам блізкія.

Індзейцы з рэзервацыі з дыстанцыяй падыходзяць да палякаў, а жыхары Новай Волі не вельмі перакана ны да тэарэтычнага візіту анейдаў, прадстаўляючых зусім іншы свет. Галоўнае, што іх, здаецца, спалучае — гэта прывязанасць і пашана да зямлі. Самыя аўтары праекта прызнаюцца, што бачна шмат чаго падобнага, усё лёгка заўважыць на працах дзяцей. Аліцыя Фронь падкрэслівае падобны спосаб бачання свету і ўспрымання сябе дзяцьмі. Але калі ідзе пра розніцы, то ў Новай Волі людзі больш адкрытыя.

— Людзі рэагавалі незвычайна, падыходзілі ў час развешвання здымкаў, цешыліся выстаўкай, амаль не сварыліся за тое, на чыёй агароджы павінны яны апынуцца, — даказвае Бартош Глябовіч.

Ды ўвесь час гэта здымкі, не жывыя людзі. Ведаю, што доўга шукаць такой адкрытасці, гасціннасці, якая сустракаецца на нашых землях, але варта помніць, што свет нашых дзядоў адыходзіць памалу, а нават хутчэй, у гісторыю.

Хто ў змозе, той абараняе яго па-свойму, можа не рэзервацыю, але напэўна бацькаўшчыну.

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Прадалі школу...

У 35 н-ры „Нівы” ад 2 верасня 2007 г. друкаваўся мой допіс „Варта самаўраду падумаць”, у якім я кранаў праблему апусцелага будынка школы ў Пашкоўшчыне. І ў гэты ж дзень, калі газета трапіла да чытачоў, у рэдакцыю пазваніў войт Арлянскай гміны наконт маёй публікацыі.

— Школа ў Пашкоўшчыне прададзена, — заявіў. — Будынак не лічыцца гмінным, а з’яўляецца ўласнасцю прыватнай асобы. Справу лічу беспрадметнай...

Прыйшлося мне высветліць справу. Пазваніў я ў Орлю і дамовіўся з войтам на сустрэчу. Было гэта 30 жніўня. Наступнага дня я быў у Пашкоўшчыне. Пакуль дабраўся да солтыса, дык пагаварыў я са знаёмымі ў Градалях, якія сказалі, што будынак купіў жыхар вёскі Райкі, уладальнік агратурыстычнай кватэры. Адны гаварылі, што арганізуе ён там агратурыстычную гаспадарку, а іншыя, што асяродак для дзетак-інвалідаў. Паколькі солтыса ў Пашкоўшчыне не застаў я ў хаце, дык вымушаны быў задаволіцца размовай з гаспадыняй. У час размовы субяседніца заявіла, што сёлета на прадвесні гміна прызначыла грошы на рамонт святліцы.

— Новай шалёўкай звонку аблажылі ды фундамент абштукатурылі. Фарбай памалявалі. Збіраюцца ацяпленне ўнутры правесці...

З Пашкоўшчыны пазваніў я войту ды прасіў адтэрмінаваць нашу сустрэчу, паколькі мне ў абедні час неабходна вярнуцца дамоў.

— Запрашаю на гарбату ў зручны час, — пачуў я ў адказ. — Прыемна будзе пазнаёміцца...

У час тэлефоннай размовы я паспрабаваў нешта даведацца аб здзелцы, якая тычылася школы і пачуў такое:

— Будынак быў прададзены ў мінулым годзе за сорак тысяч злотых. Не пры мне здзелку праводзілі. Сындык гэтым займаўся. Новы ўладальнік нічога не рабіў у мінулым годзе, дык сёлета добраўпарадкаваннем заняўся...

— А як маецца справа школ у Малінніках і Вульцы-Выганоўскай?

— Наконт Малліннікаў скажу такое. Быў аб’яўлены аўкцыён. Дагэтуль не знайшоўся інвестар. А школу ў Вульцы-Выганоўскай хочам таксама прадаць. Гэта справа часу, — канстатаваў на заканчэнне кіраўнік арлянскага самаўрада. Столькі напачатак удалося мне высветліць у згаданай справе. Спадзяюся, што да тэмы неўзабаве вернемся, аб чым і напішу ў чарговым допісе.

Уладзімір СІДАРУК

У пушчы

Зараз значна паправілася даступнасць Белавежскай пушчы. Раней турысты, якія наведвалі каралеву польскіх пушчаў, няшмат часу праводзілі ў лесе. Розныя былі гэтага прычыны, між іншым, і малая колькасць вызначаных турыстычных шляхоў ды прыродазнаўчых сцяжынак. А цяпер наведвае пушчу ўсё больш і больш індывідуальных турыстаў. Для іх маецца даволі вялікая база агратурыстычных кватэр, новыя гасцініцы ды пансіянаты.

Пушча вабіць сваёй чароўнасцю ўвесь год. Восень, аднак, гэта тая пара года, калі лес асабліва прыгожы. У палавіне верасня пачынаецца шлюбны перыяд аленяў. Яны — цікавая містэрыя натуры!

Белавежская пушча вялікая скарбніца прыроды не толькі ў Польшчы, але і ў Еўропе. Гэта адзін такі ў Польшчы вялікі лясны комплекс з перавагай ліставых дрэў. Тут пражывае найбольшы ў Польшчы статак зуброў.

У белавежскіх лясах елкі, дубы, ясені і ліпы дасягаюць імпазантных размераў, перавышаючых сваёй велічынёй 15-павярховыя будынкі, а некаторыя экземпляры дажываюць нават некалькісот гадоў.

Белавежскі нацыянальны парк, як адзін з трох у Еўропе і адзін з сямі ў свеце, з’яўляецца аб’ектам сусветнай спадчыны. Гэта адзіны на нашым кантыненце фрагмент лесу на нізоўі і захаваны амаль у натуральным стане. Такія лясы раслі ў нашай краіне 1 000 гадоў таму.

Турысты найчасцей наведваюць Паказны запаведнік зуброў і конікаў-тарпанаў, аленяў, сарнаў, дзікоў і ваўкоў. Заходзяць таксама ў Прыродазнаўча-лясны музей у Палацовым парку. Ды сам Палацовы парк цікавы. У ім 90 відаў дрэў і кустарнікаў. Ёсць тут збудаванні з царскіх часоў — двухпавярховы дом паляўнічага, даўняя брама з чырвонай цэглы (вяла яна да палаца, якога зараз няма).

Шмат асоб наведвае асабліва ахоўваемы заказнік. Ходзяць турысты таксама шляхам Рэбры зубра і шляхам да Месца моцы (з карыснай для чалавека вібрацыяй). Наведваюць па дарозе скансэн. З Гайнаўкі ў Тапіла можна ў павольным тэмпе ездзіць вузкакалейкай і захапляцца краявідамі пушчы.

У прыпушчанскіх вёсках захаваліся прыгожыя драўляныя цэрквы, між іншым, у Ласінцы, Нарве, Старым Ляўкове, Трасцянцы і Вэрстоку. У раёне Белавежскай пушчы можна сустрэць драўляныя хаты, акрэсленыя этнографамі як гайнаўска-бельскага тыпу, а таксама драўляныя платы, брогі і рознага тыпу кладкі ды прыдарожныя высокія драўляныя крыжы і каплічкі.

(мох)

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп’ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2008 r. upływa 5 grudnia 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na I kwartał 2008 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji.

Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Nakład: 1 000 egz.

Суседскія былі

ГУМАННЫ МЕТАД

Стары Язэп Германовіч скруціў самакрутку з уласнага дамасаду і абрыўка раённай газеты „Пуцём Ільіча", зацягнуўся крэпкім як адляцеўшая ў нябыт сіла маладосці тытунём, узяў вяроўку, аўстрыйскі штык-нож часоў першай сусветнай вайны і, сагнуўшыся ў тры пагібелі, рушыў у хлеў з хуткасцю, якую яму дазвалялі яго семдзесят дзевяць гадоў. Там ён крыху пастаяў, трымаючыся за агароджу, што раздзяляла свіней ад іншых жыхароў жывёльнай хаты, аддыхаўся і завязаў вяроўку на назе сумнай свінні, вагой кілаграмаў пад дзвесце. Сабраўшыся з сіламі, Германовіч паспрабаваў выцягнуць напалоханую жывёліну на вуліцу. Але тая, ці то ёй не спадабалася, што Язэп не зачытаў ёй яе правы, ці яшчэ па якой незразумелай прычыне, рванула ў адваротным напрамку і збіла гаспадара з ног. Затым села ў куток і паглядзела на чалавека. У яе вачах, нібыта чорным па белым, як у газеце „Пуцём Ільіча", было напісана: „Калі ты, стары дурань, надумаўся зрабіць з мяне адбіўныя ў таматным соусе або катлеты запечаныя на чыгуннай патэльні, то мушу табе адказна і сур'ёзна заявіць, што я супраць". Іншыя сведкі гэтай сцэны, пачынаючы ад каровы і завяршаючы курамі, не адрэагавалі на тое супрацьстаянне свінні і чалавека аніяк.

Язэп падняўся, выпаўз з хлява, памыўся, пераапрануўся і пасунуўся ў цэнтр вёскі да будынка з надпісам „Пошта". Там ён узяў бланк тэлеграмы і напісаў толькі адзін сказ: „Сынок, прыязджай па свіныя плечы".

— Нічога, — бубнеў ён сабе пад нос, вяртаючыся дахаты. — Мяне сілы можа і пакінулі. Але ж у мяне ёсць малады, дужы і разумны сын. Прыедзе, тады свінню і заколем. Трэба было зразу яго паклікаць. Я ўжо стары і нямоглы. А жадаць ад свінні, каб яна сама сябе закалола, таксама дурная думка. Я шмат пражыў на гэтым свеце, а такіх выпадкаў не прыпамінаю.

Сын прынёсся ўжо назаўтра з торбамі і мяхамі. Акрамя свіных плячэй ён меркаваў узяць яшчэ і заднія ногі, таксама ногі пярэднія, паляндвіцу, шыю, скабы, печань, ныркі, сэрца, галаву, капыты, хвост і ўсе астатнія свіныя часткі. А таксама крыху бульбачкі, маркоўкі, часначку, цыбулькі, яблычкаў і іншых рэчаў, якія не хацелі расці ў яго гарадской кватэры.

— А чаму свіння яшчэ рохкае? — прывітаўся Германовіч малодшы, прымусіўшы тым самым бацьку пачаць апраўдвацца.

— Няма ў мяне сілы ўжо яе адолець, — растлумачыў той. — Думаю, ты гэтым зоймешся.

— Ну вось табе і раз, — занервавуся сын. — Не мог каго з вёскі папрасіць, каб дапамаглі? У мяне ж зусім няма часу!

— Ну то чашы сабе адсюль, — разлаваўся бацька. — Але без мяса.

— Ды не злуй ты, — змяніў тон голасу сын, напалоханы такімі перспектывамі. — Нешта зараз прыдумаем.

— А што тут думаць, — узрадаваўся Язэп, якому і самому хацелася ўжо адведаць свежаніны. — Вось нож, а вунь хлеў. Не забыўся яшчэ? А то да бацькі толькі па мяса і прыязджаеш.

— Не, — не пагадзіўся жыхар горада, зразумеўшы, што ён нажом у сэрца свінні не патрапіць і з тысячнага разу. — Калоць свіней гэта састарэлы метад. І вельмі негуманны. Ды і антызаконны, бо твой аўстрыйскі штык гэта халодная зброя. За яе, чаго добрага, і пасадзіць могуць. Як ты думаеш, колькі трэба было б часу, каб на гарадскіх бойнях жывёлу штыкамі паролі? Не! Мы заб'ём гэтую паскуду пасучаснаму. Гуманна. Токам у галаву раз і капыты ўгору. Жывёліна нават і падумаць не паспее, што яе канчаюць. І мяса тады смачнейшае будзе.

— Нешта я не прыпамінаю, каб ты ад таго мяса адмаўляўся, якое нажом білі, — незадаволена буркнуў Язэп. — Не паспееш пасмажыць, як з патэльні хапаў. І дзе гэта бачна, каб токам калолі свіней. Ты яшчэ прапануй у газаваю камеру яе засунуць! Ці расстраляць з танка. У нас жывёлу заўсёды нажом білі.

— Бо вы ўсе састарэлыя і дрымучыя чэрапы, — пачаў настойваць на сваім прыхільнік гуманнага метада. — Век жыві — век вучыся. Мы ў горадзе лепш ведаем, што рабіць. Бо ў нас прагрэс, новыя тэхналогіі, ноў-хаў розныя, а ў вас тут адсталасць ды запусценне. Ні халеры не хочаце развівацца.

Пасля такога навучання нічога не заставалася як пагадзіцца. Сын дастаў з машыны правады для падзарадкі акумулятара, падаўжальнік, злучыў іх разам і ўключыў у разетку.

— Ну што, бацька, — кажа ён, — сядай на свінню конна і моцна трымай яе за вушы, каб не ўцякла. А я зараз засуну ёй ток у нос.

Як сказаў, так і зрабіў. І тут у хляве бліснула маланка. Бліснула — не тое слова. Святло ад разраду току было такім моцным, што з кепскім зрокам стары за імгненне паспеў прачытаць газетны артыкул на сваёй самакрутцы, хаця артыкул быў надрукаваны дробным шрыфтам, а чытач быў без акуляраў. Адначасова з засваеннем газетнай прапаганды Язэпа як пяро знесла са свінні, падняло ў паветра і маханула ў сцяну. Нават карова павалілася набок ад нечаканасці і перапалоху. У курэй пазляталі пёры. Трусы перасталі размнажацца. Гусі ўвогуле здохлі адразу. Святло прапала ва ўсей вёсцы і ў прылягаючых да яе калгасных пабудовах. А свіння паднялася як чалавек на дзве нагі і завыла ваўкалакам. Пасля рванула ўбок, зламала агароджу, вынесла дзверы хлява і знікла ў кустах чырвонай парэчкі. Толькі гарадскі прыхільнік гуманных метадаў стаяў аслупянелы як статуя невядомаму для яго мужыку на цэнтральнай плошчы ў яго горадзе, і трымаў у руках правады, на канцах якіх смылела свіная шэрсць.

— Сынок, мы каго колем сёння, свінню ці мяне, — прастагнаў стары Германовіч як толькі да яго вярнулася здольнасць размаўляць.

— Свінню, канечне, тата, — сеў азадкам у гной збянтэжаны сыночак. — Як ты мог падумаць, што гэты выбух некантраляванай хаатычнай электрычнасці быў спланаваны супраць цябе?

— Ну то свіння ўжо ўцякла, — уздыхнуў стары. — Яе хіба ваўкі або сабакі даядаюць. Смачна ім недзе. Ядуць і аблізваюцца, бо паляцела яна адсюль ужо добра падсмажаная. Як у духоўцы. Трэба было перад гуманным смажаннем яе яшчэ крыху пасаліць, перчыкам пасыпаць і дабавіць цыбулькі.

— Не ведаю, бацька, што я тут няправільна зрабіў, — задумаўся сын, не падымаючыся з гною. — Можа ток слабы? Ты толькі не хвалюйся. Свіння не ўцячэ. Я яе знайду.

— Добра, сынок, знайдзі, — усміхнуўся бацька. — І на гэты раз, як будзем яе калоць гуманным метадам, току дадзім колькі захочаш. Толькі адна ўмова. Цяпер ты яе будзеш трымаць за вушы, а сунуць правады ў нос буду я.

Віктар САЗОНАЎ

23.09 – 29.09

Баран (22.03. — 20.04.) Спрыт, размоўнасць, знакамітыя ідэі. Да 28.09. не будзе для цябе сітуацыі без выйсця. З асобай, з якой сустрэнешся ў гэтыя дні, цяжка будзе табе расстацца. Росквіт пачуццяў у пары.

Бык (21.04. — 21.05.) Дробныя сямейныя непаразуменні. Памятай, што празмерная апякунчасць не кожнаму ідзе к дабру. Стоміць цябе хаджэне па кавярнях і клубах. На жаль, парвеш кантакты з некаторымі знаёмымі.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Дзякуючы энергіі Марса не маеш праблем з выражэннем сваіх патрэб і іх рэалізацыяй. Цяжкасці і спазненні могуць цябе толькі мабілізаваць. У выпадку сямейных праблем разлічвай на суседзяў і сяброў.

Рак (23.06. — 23.07.) Спрыт і лёгкасць у целе. Кемлівасць, какецтва. Вялікія поспехі ў другога полу. Вялікая адвага, паспяховасць у дзеяннях. Чакае цябе аплаўз сярод сяброў і перамога сярод тых, хто з табой не лічыўся. Адно 26.09. бацька або шэф папсуе табе настрой.

Леў (24.07. — 23.08.) Хоць будзеш цешыцца захапленнем тваёй асобай, з цяжкасцю знойдзеш такую, на якой табе будзе залежыць. Дапамогу можаш знайсці ў новапазнаных людзей, а таксама ў кіраўніцтва. Абмяжуй кантакты з песімістамі, сустракайся з радаснымі, энергічнымі, ненаракаючымі на жыццё.

Дзева (24.08. — 23.09.) Хоць можаш перажыць любоўныя перыпетыі, не страціш надзеі на сапраўднае каханне. Затое ў прафесійных дзеяннях няма табе роўных. Вельмі добра ў фінансах; зможаш паехаць у падарожжа.

Шалі (24.09. — 23.10.) Канец месяца можа быць неласкавы для тваёй сям'і. Не рабі нічога, каб даліць яшчэ алівы да агню. Ды будзеш камунікатыўны, пераканаеш усіх да сваіх рацый. Дасканала пойдуць справы ва ўстановах, у бізнесе, экзамены, курсы, навука.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Неспадзяваны прыбытак у кашальку. Зможаш вывесці на просты шлях справы, на якіх табе здаўна залежыць. Добры час на інвестыцыі. Калі ў каханні хочаш раздаваць карты, ведай, што ў выпадку паразы возьмеш віну на сябе.

Стралец (23.11. — 22.12.) Жыццё цябе навучыць, што заўжды трэба быць падрыхтаваным на змены абставін. Хатнія пераканаюцца, што яны без цябе як рыба без вады. Падтрымай на духу сябра ў яго праблемах; не пакідай яго аднаго. На працы твае старанні прынясуць узгнагароду.

Казярог (23.12. — 20.01.) 26.09. не вельмі мілая атмасфера дома; сям'я можа цябе вывесці з нерваў! Затое іншыя справы пойдуць гладка і прыемна, сустрэне цябе прыхільнасць атачэння. Хоць можаш расчаравацца ў асобах, якія самі з сябе запрапануюць табе дапамогу.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Агністыя пачуцці, захапляючыя жарсці. З-за новых сітуацый можаш адчуваць сябе як у трансе. Набярэш смаку да новага досведу. Лепш дагаворышся з мужчынамі, чым з жанчынамі.

Рыбы (20.02. — 21.03.) 26-29.09. Палада ў квінкунксе да Сонца — клопаты на працы і ў прафесійнай дзейнасці. Можаш расчаравацца ў асобе, якой заўжды давяраў. Будзь асцярожны ў фінансах, на раскідайся грашыма. Памятай, што важныя дзеянні, а не выпадковыя жэсты. Пазмагаешся за слушную справу.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

		1	2	3	4	5
		6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — заўвагу Рамона Гомеса дэ ла Серны.

1. валакністы матэрыял з бавоўны, воўны або сінтэтычнага валакна для медыцынскіх, бытавых або тэхнічных мэт = 3 _ 17 _ 15 _ 2 _;

2. ручное прыстасаванне з пласцінак у выглядзе складнога паўкруга, якім абмахваюцца ў духату = 13 _ 14 _ 10 _ 16 _;

3. партнёрка пеўня = 5 _ 4 _ 8 _ 7 _ 6 _ 12 _;

4. упадзіна на сярэдзіне жывата пасля адпадзення пупавіны = 11 _ 9 _ 1 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 33 нумара

Шэсце, збыт, гол, юань, Тонга, быстрыня, еднасць, кацельня, пашпарт, цюль, ніць, цеціва.

Рашэнне: **З таго паны сыцеюць, што беднякі пацеюць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

ISSN 0546-1960

Ніва
ПРА ВЯСКОВАЕ

У час сёлетняга юбілейнага мерапрыемства арганізатары зрабілі стаўку на большую колькасць атракцыёнаў, спалучаных з жыццём і змаганнем у мінулым....

Збуч — славутае мінулае

Да юбілейнага V Археалагічнага фэсту, які 9 верасня адбыўся на даўнім гарадзішчы побач Збуча, войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк, гмінныя працаўнікі і мясцовая група дзеяння „Белавежская пушча" падрыхтаваліся з асаблівай стараннасцю. Зрабілі яны стаўку на археалагічную адукацыю моладзі, якая яшчэ да мерапрыемства прымала ўдзел у раскопках на гарадзішчы і рашыліся дакладней пазнаёміць мясцовае насельніцтва і турыстаў са славутым мінулым зямель, распаложаных вакол сённяшняга Збуча. На мерапрыемстве можна было ўбачыць узоры даўняй зброі і іншыя атракцыёны, спалучаныя з жыццём збуцкага гарадзішча ў далёкім мінулым. Побач калектываў з Чыжоўскай гміны выступілі іншыя гурты з разнароднай музыкай. Наймалодшым дзеткам быў пастаўлены гарадок для гульняў, а старэйшыя вучні ў асноўным цікавіліся ваеннай тэхнікай і заняткамі нашых продкаў.

Хаця быў пахмурны дзень і час ад часу браўся ісці невялічкі дожджык, на тэрыторыі гарадзішча сабралася многа людзей. Старэйшыя асобы яшчэ загадзя займалі месцы на лавачках перад сцэнай, на якой мелі выступаць фальклорныя і эстрадныя калектывы. У гэтым годзе мерапрыемства не пачалося з гмінных дажынак, як было ў мінулых гадах, але войт Юрый Васілюк паінфармаваў, што дажынкі прадбачаны на пазнейшы час. Гаспадары, аднак, маглі паглядзець на лепшую раслінную прадукцыю гэтага года, прэзентаваную працаўнікамі Гайнаўскага аддзялення Сельскагаспадарчага дарадчага асяродка. У час сёлетняга юбілейнага мерапрыемства арганізатары зрабілі стаўку на большую колькасць атракцыёнаў, спалучаных з жыццём і змаганнем у мінулым.

Пазнаёміцца з гісторыяй

Дар'юш Краснадэмбскі, археолаг Інстытута археалогіі і этналогіі Польскай акадэміі навук, які ўжо некалькі гадоў даследуе збуцкае гарадзішча і яго наваколле, сёлета працаваў між іншым з моладдзю. У час летніх работ на гарадзішчы быў раскопаны насып у месцы, дзе, як меркавалася, была збудавана брама. Быў знойдзены стоўб, які мог быць часткай брамы і шкілеты людзей, пахаваных прыблізна ў XVII стагоддзі. У час прац высветлілася, што звонку насыпу быў вялікі роў з вадой, які дапамагаў абараняцца ад захопнікаў, а ўсярэдзіне другі, якім хутчэй за ўсё адводзілася вада з гарадзішча збудаванага на глінянай паверхні. Некалькі гадоў таму ў іншым месцы насыпу былі знойдзены шкілеты XIV-XV стагоддзяў. Дар'юш Краснадэмбскі лічыць, што само гарадзішча збудаванае было ў IX-X стагоддзях і можа быць нават старэйшым за бельскае. Наведвальнікі збуцкага мерапрыемства маглі паглядзець на фрагмент раскапанага насыпу і распытаць пра вынікі археалагічных работ. Плануецца рэканструяваць браму і фрагмент насыпу з абарончай агароджай на даўні лад, каб былі яны атракцыёнамі для турыстаў і на працягу цэлага года прыпаміналі славутае мінулае.

Традыцыйна ладзіліся змаганні рыцараў

— З нагоды юбілейнага фэсту мы падрыхтавалі яшчэ больш гістарычных атракцыёнаў, чым у мінулых гадах. Побач даўняй славянскай культуры, паказваем таксама рыцараў і кельцкае рамяство, — заявіў войт Юрый Васілюк, галоўны арганізатар мерапрыемства.

Цікавасць да зброі і рамяства

Усярэдзіне гарадзішча мужчыны і дзеткі збіраліся побач месцаў, дзе паказвалася сярэдневяковая зброя, а аматары стральбы маглі паспрабаваць страляць з лука. Пазней былі змаганні рыцараў, пераапранутых за славян і кельтаў. Бацькі крыху апасаліся за найменшых дзетак, якія спачатку глядзелі з захапленнем на падрыхтоўку да ваенных дзеянняў, а ў час барацьбы спалоханыя хаваліся да сваіх родзічаў. Можа і непатрэбна бацькі паказалі сваім дзеткам жорсткую барацьбу, бо ў гарадзішчы для іх было адведзена асобнае месца, названае гарадком гульняў. Былі там разнародныя прылады, на якіх дзеткі гулялі з вялікай радасцю.

Жанчыны цікавіліся хатнімі заняткамі ў мінулым, мясцовым народным рукадзеллем, куплялі сувеніры стылізаваныя на старадаўні лад. Многа людзей збіралася побач месцаў, дзе паказвалася сярэдневяковае рамяство. Ужо традыцыйна працавала „дымарка", у якой выплаўлялася жалеза, можна было пазнаёміцца са старадаўнім кавальскім рамяством і вырабамі, якія выконвалі таксама не так даўно кавалі са Збуча, Чыжоў ці Кленік. Публіцы прапанавалася мясцовае харчаванне, сярод якога былі таксама мясныя вырабы са страусаў і вялікія страусавыя яйкі, якія прывёз Сцяпан Чабай з Новага Беразова. Да жыхароў Чыжоўскай і суседніх гмін, якія ў час перапісу насельніцтва масава назвалі сябе беларусамі, выпадала выйсці з друкаваным беларускім словам. Удзельнікі фэсту маглі бясплатна атрымаць наш тыднёвік і набыць беларускія кніжкі аб адносна недалёкім мінулым. Прэзентавала іх наша рэдакцыйная сяброўка Ілона Карпюк.

Не абышлося без спеваў

Хаця побач Збуча штогод выступаюць калектывы з Чыжоўскай гміны, не прыеліся яны нават пастаяннай публіцы. Мясцовыя спевакі рыхтуюць на фэст штораз новы рэпертуар і стараюцца са сцэны весці дыялог з публікай, што падабаецца старэйшым людзям, а мясцовыя песні ў выкананні суседак ці суседзяў, выклікаюць больш эмоцый. Арганізатары штогод запрашаюць гасцей, з ліку якіх у гэтым годзе вылучалася „Чарамшына". Выступленні на сцэне традыцыйна перапляталіся з разнароднымі конкурсамі для дзетак і дарослых. Настаўнікі чыжоўскай школы, якія разам з дырэктарам Міраславам Пяткевічам прымалі ўдзел у археалагічным мерапрыемстве, назіралі за сваімі вучнямі. Удзел моладзі ў археалагічных раскопках і фэсце быў вельмі добрым урокам гісторыі. Вучні Чыжоўскай гміны якія амаль стопрацэнтна ходзяць на заняткі беларускай мовы, змогуць выкарыстаць здабытыя веды і вопыт у час урокаў роднай мовы і на іншых прадметах.

Публіцы спадабалася рэкламная выстаўка „Нівы"

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Царква і касцёл у Кляшчэлях

Такая гміна

Куды паехаць у гэтым годзе? Абяцаў я Трусевічам — гаспадарам агратурыстычнай кватэры ў Міхалове што яшчэ раз завітаю ў мястэчка на веласіпедныя вандроўкі, хоць Міхалова не з'яўляецца мястэчкам, хаця вёскай таксама не. Аказваецца, што жыхарам Міхалова, як і іх уладам, лепш быць вёскай чым горадам. Чаму лепш, не ведаю. Абяцаў я таму, што апрача актыўнага адпачынку хацеў аб'ездзіць неадкрытыя для такога турыста як я куткі беларушчыны. Можа за год, калі здароўе дазволіць.

Пакуль што — а гэта быў пачатак жніўня — сяджу на панадворку агратурыстычнай кватэры спадарства Зіневічаў. Нарэшце на панадворку, бо да гэтай пары ліў дождж і было холадна як у псярні. А зараз грэе сонца, за чыгункай Гайнаўка — Чаромха шуміць пушча і час цячэ памаленьку. Нідзе не трэба спяшацца і нічога рабіць. Толькі вандраваць па знаёмых ужо сцежках.

— У Чаромсе-Вёсцы свята Ільі, — кажуць жанчыны на лавачцы ў Рэпчычах. У Чаромсе-Вёсцы фэст і запрашаюць мяне туды з'ездзіць. Пакуль я не планаваў ехаць туды.

На пошце ў Кляшчэлях удалося заказаць „Выборчу", да якой я гадамі прывык. І „Ніву" таксама заказаў. На другі дзень з раніцы пашталён прынёс мне заказаныя газеты на агратурыстычную кватэру.

Ньюсаў у „Газеце" не было. Лепера яшчэ не пасадзілі, хварэе, Гертых у водпуску. Выбіраюцца на адпачынак браты, дзесьці на Гель. Цікава на як доўга, бо ж палітычная сітуацыя нестабільная. Добра, што не прыдумалі ехаць адпачываць у Белавежскую пушчу, як калісь Цімашэвіч, бо спакою, нават тут на скраю пушчы, у агракватэры спадарства Зіневічаў не было з-за смутных паноў за цёмнымі акулярамі.

Адпачынак адпачынкам, хоць ён і актыўны, і веласіпедны, але чаму ж пры гэтай нагодзе не даведацца чагосьці пра Кляшчэлеўскую гарадскую гміну і падзяліцца з чытачамі „Нівы" сваімі ўражаннямі.

Удалося наладзіць кантакт са старшынёй Гмінна-гарадской рады ў Кляшчэлях. Пішу ўдалося, бо хаця гэта публічная асоба, сакратарка бурмістра не хацела даць мне нумар яго тэлефона, бо ён — як сказала — прыватны. Тэлефон, не старшыня. Нумар тэлефона здабыў я быццам сапраўдны следчы журналіст. „Ніва", як мне вядома, такога не мае, хоць пэўныя рысы следчага праяўляе Аляксандр Вярбіцкі, які сочыць за культурай у гмінах. Аказваецца, што старшыня Рады горада Кляшчэлі мае сваю фірму, а калі так, то пэўна ён там і знаходзіцца, а затым будзе магчымасць нешта даведацца пра прыпушчанскую гміну. Старшыня Рады вялікай ахвоты на гутарку пра гміну не меў. Але па трох днях размова атрымалася, дзякуючы пэўнаму, прызнаюся, брыдкаму шантажу. „Я, веласіпедны турыст, — сказаў я, — цягнуўся пяцьсот кіламетраў да вашай прыпушчанскай гміны заахвочаны інфармацыяй з інтэрнэт-старонкі пра вашу прыгожую мясцовасць, хачу паглыбіць веды і, мабыць, можа заахвоціць сяброў і знаёмых прыязджаць сюды адпачываць на ўлонні прыроды, а вы, — кажу далей, — грамадскі дзеяч, не маеце хвіліны часу?" Тады старшыня Гарадской рады знайшоў час. Пытанні я прыгатаваў загадзя.

— Якую карысць мае гміна з таго, што належыць да Таварыства гмін Белавежскай пушчы? — пытаю. Старшыня аднак не ведаў нічога аб карысцях. Затое сакратар гміны Аліна Снарская — так. Згуртаванне 26 гмін усходняй Беласточчыны, са старшынём Яўгенам Берэзаўцом, паўстала 17 красавіка 2007 года дзеля лепшага супрацоўніцтва пры рэалізацыі супольных звышгмінных праектаў.

Пра інвестыцыі ў горадзе і гміне даведаўся я з інтэрнэт-старонкі. Пра зрэалізаваныя: школа, ачышчальня сцёкаў, санітарны калектар, вадасховішча Рэпчычы і т.д. і запланаваныя: будова спартыўнага і рэкрэацыйнага комплексу, гарадскога амфітэатра, мадэрнізацыя стадыёна, разбудова каналізацыйнай сеткі, будова веласіпедных і конных сцежак, крытага басейна і інш. Для прыкладу, разбудова каналізацыйнай сеткі ў Кляшчэлях і Дабрывадзе будзе каштаваць пяць з палавінай мільёна злотых да выкарыстання ў 2007 годзе. Ужо пачатак жніўня, якая частка інвестыцыі ўжо выкананая? — пытаю Аліну Снарскую, бо старшыня Рады, як сам сказаў, гаспадарчымі справамі не займаецца. Пакуль што няма грошай на інвестыцыю, затым на разбудову каналізацыйнай сеткі не выдалі нават залатоўкі.

Які працэнт беспрацоўя ў гміне? Адказваюць мне, што статыстыка беспрацоўных не вядзецца, але беспрацоўе ёсць. Аднак калі хочам наняць працаўніка, то ёсць з тым праблема. Няма ахвотных працаваць. Можна на гэтай падставе меркаваць, што ў гміне няма беспрацоўных.

Якая была яўка жыхароў гміны на апошніх выбарах у самаўрады? Аказваецца, перавысіла 50%.

У гміне ў час перапісу насельніцтва да беларускай нацыянальнасці прызналася больш за 20% жыхароў. У школе вядзецца навучанне беларускай мовы. Не ўсе вучні яе вывучаюць, бо гэта залежыць ад бацькоў. Я падкінуў думку, каб бацькі складалі негатыўную дэкларацыю, значыць, заяву, што бацькі не хочуць, каб іх дзеці вучыліся беларускай мове. Хто не падасць такой заявы, значыць, згаджаецца пасылаць дзіця на ўрокі беларускай мовы.

Справы пушчы больш датычаць Еўрарэгіёна Белавежская пушча. Мы тут згодны ўсе, кажуць, і ўлада, і насельніцтва супраць утварэння рэзервата ў пушчы, таму што яго існаванне затармозіць гаспадарчы прагрэс. Нельга тады будзе вакол пушчы адкрываць прадпрыемстваў, перш за ўсё, прадпрыемстваў сельскагаспадарчай пераапрацоўчай прамысловасці.

У Кляшчэлях найбольшае прадпрыемства — „Дрэвэксполь". Працуе ў ім больш за сто работнікаў. Дзейнічае таксама некалькі сямейных фірм. Сельская гаспадарка занікае. У гміне землі пятага, шостага класаў. Не аплачваецца на іх гаспадарыць, калі ёсць магчымасць знайсці працу ў Нарвегіі ці Ірландыі.

Насельніцтва гміны не зацікаўленае двайнымі назвамі мясцовасцей. Няма такой ініцыятывы з боку жыхароў, — кажа сакратар гміны. Але бракуе такой ініцыятывы і з боку гмінна-гарадскіх улад, а калі так то няма і праблемы, — працягваю думку. Такая гміна. Не адна яна.

Нарэшце прыгрэла сонца. Нядзеля. Цішыня. Нават вераб'і перасталі цырыкаць, як бы ведалі, што гэта святочны дзень. Еду ў лес, а дакладней у пушчу, па веласіпедных сцежках. Не зараслі яны, значыць, турысты катаюцца па іх на веласіпедах. Прызабыў я толькі іх разгалінаванні. Замест даехаць да слаўнай Апакі-Вялікай, даехаў я да Пагулянкі. З Пагулянкі падаўся назад, да Дабрывады, да спадарства Зіневічаў. Два гады таму ездзіў я па пушчанскіх сцежках, не заглядаючы ў карту.

Хоць быў гэта святочны дзень, дзе-нідзе працавалі камбайны, збіралі жыта. Зямля не можа ляжаць аблагом, хоць больш надаецца пад лес, чым пад збожжа. Зараз, як і калісь, мала хто ўтрымліваецца з зямлі, — кажа мой аграгаспадар Міхал. Калісь, пры камуне большасць працавала на чыгунцы, паколькі Чаромха з'яўлялася магутным чыгуначным вузлом. Цяпер усё прыціхла, таварных паязда́ў бадай што няма. Ездзяць шыновыя, — як кажуць тутэйшыя — аўтобусы. Нават часта курсуюць туды і назад.

Пра культуру ў Кляшчэлях успеў перада мной напісаць Аляксандр Вярбіцкі. Пэўна ён зведаў усе куткі Беласточчыны і пазнаёміўся з усімі солтысамі беларускіх вёсак.

На размову пра культуру ў гміне з дырэктарам Гарадскога асяродка культуры ў Кляшчэлях дамовіцца мне не ўдалося. Перасяленне з пажарнага дэпо ў адрамантаваны будынак былой школы гэта вельмі працаёмкая справа. Некалькі хвілін, таксама вельмі занятая, ахвяравала мне працаўніца Гарадскога асяродка культуры Яўгенія Казімерук. З інтэрнэт-старонкі Кляшчэлеўскай гміны даведаўся я пра часопіс „Co słychać w gminie". Ці ёсць можа актуальны экземпляр гэтага выдання? — пытаю. Спадарыня Казімерук кажа, што часопіс „Co słychać w gminie" выдаецца хатнім спосабам. „Не друкуем, толькі робім ксеракопіі, найсамперш падрыхтаваўшы камп'ютэрны набор і надрукаваўшы яго на прынтэры. Пакуль, часопіс наш не мае свайго індэкса PL ISSN, выдаецца як лакальная газета пры фінансавай падтрымцы Управы горада. Калі часопіс выходзіць на грамадскіх пачатках, то яго назву трэба было б перыядычна мяняць, напрыклад, на „Co było słychać w gminie w lutym i marcu", бо таго часу датычыць у ім інфармацыя. Для мяне і так гэта была немалая крыніца ведаў пра гміну. Даведаўся я, што выбралі новых солтысаў, і што новаабраны бурмістр не паспеў выслаць „oświadczenia o działalności gospodarczej prowadzonej przez małżonkę" (хто

працяг ☞ III

На Спаса ў Плёсках

Жара мінула, хоць сонейка моцна яшчэ грэла, аднак адчувалася ўжо надыход канца лета. Палеткі апусцелі, амаль усё збожжа было ў клунях. Да Спаса асталося больш тыдня. Бабы займаліся дамашнімі працамі. Пад вечар мы з мамай пайшлі па авечак у Грыднісак. Баяліся, што зноў воўк схопіць якую авечку. Учора, калі бабуля Гануся задрамала была пад корчыкам, ціхенька падпоўз воўк ды схапіў авечку і ўцёк у лес. На шчасце Федзя з Пескоў, які пасвіў сваіх кароў пасуседску, убачыў гэта і, узяўшы палюгу, давай бегчы за ваўком ды крычаць на ўсё горла: „Воўк, воўк, воўк!..” Спужаўся нягоднік, пусціў авечку, а сам ходу ў лес шукаць другога статка.

Авечку, якая зусім разгубілася ад страху, трэба было ўвесь тыдзень трымаць у хляве. Ваўкоў у той час у нашым лесе было многа. І ў маёй сям'і здарылася такая сумная гісторыя.

Было гэта на Вялікдзень, авечкі яшчэ не выходзілі на поплаў, стаялі ў хляве. Бацькі кудысьці паехалі, даглядаць быдла загадалі дочкам. Манька з Надзяй паспрачаліся і забыліся заперці дзверы хлява. Авечкі (не дарма прымаўка: дурная, як авечка) выйшлі вечарком з хлява і непрыкметна пабеглі ў Грыднісак. Бацькі вярнуліся ўпоцемках, шукаць авечак ноччу не было як. Толькі раненька, ледзь свет, адна з авечак (а было іх сем), параненая і блудная, вярнулася дамоў. Усе шэсць авечак ваўкі разарвалі, а чаго не маглі з'есці, заграблі пад кусцікам на нашым поплаве ў Грыдніску.

Авечак гаспадары гадавалі многа. Не толькі дзеля смачнага мяса, але і воўна патрэбная была на чосанкі, і шкуры на кажухі. Зімы былі халодныя, марозныя. Бабы ткалі з воўны прыгожыя дываны, каб святам паслаць ложак і палажыць на ім, вялізныя як горы, пуховыя гусіныя падушкі з вышыўкай і мярэжкай. Кожная паненка хвалілася дыванамі і падушкамі: гэта быў яе пасаг. У нашай хаце таксама ляжалі велізарныя падушкі і „яські”, а на сценах вісялі вышываныя бліскучымі рознакаляровымі ніткамі макаткі. У кутку ікону атуляў белы як снег ручнік, вышыты крыжыкам у чырвоныя ружы.

Назаўтра пахаладнела, сонца скрылася за хмарамі, імжэў цёплы дожджык. Кажуць: пачалі расці грыбы, будзе вялікі высып грыбоў. Надзя з сяброўкамі Зінкай і Олькай пабеглі ў лес, аж пад Кожына. Узялі і мяне. На Глыбокай даліне мы нагалапужылі маленькіх грыбочкаў, якія свае чырвоныя галоўкі выхіналі з сярэбранага імху. Тыя, з белымі галоўкамі і доўгімі каранямі сядзелі ў імху высокім ды зялёным. На пліскі мы нават увагі не звярталі. У абед былі мы ўжо дома з поўнымі кошыкамі. А мне, калі я вярталася з лесу, здарылася штосьці неверагоднае — так закруцілася ў галаве, што да самага рова, што пры нашым агародзе, я не пазнавала ні вёскі, ні дарогі. Бегла я за дзяўчатамі ззаду і не азывалася. Толькі пераходзячы кладку мне ў галаве раптоўна адкруцілася і я адразу пазнала свой агарод і сваю хату.

Заўтра чацвер, у Бельску таргавы дзень. Дзяўчаты пачысцілі грыбочкі, палічылі і асцярожненька паклалі іх у невялікія кошыкі, каб раненька назаўтра, перавесіўшы два з іх на паяску праз плячо ды несучы яшчэ адзін у руках, ісці пехатою ў горад, на рынак. Ішлі найчасцей на Кнаразы; наўпрасткі бліжэй было. Папоўдні сястра, прадаўшы грыбы, вярнулася дамоў. Цукерак мне не купіла, казала, што мусіць назбіраць грошай на мазайку пад Спаса, а цукеркаў купіць у свята пад царквой. Старэйшая сястра Манька таксама збірала грошы на мазайку. На Спаса абавязкова кожная дзяўчына шыла сабе новую сукенку. Тады якраз былі вельмі модныя мазайкі.

Манька з мамай пасля заканчэння жніва ў сябе, наняліся жаць у багатага гаспадара ў Кнаразах. Выходзілі яны на працу ледзь світала, а вярталіся калі было ўжо цёмна. За грошы трэба ж было жаць не адгінаючы спіны ўвесь дзень. Кармілі таксама слабавата. Узбіраўшы грошыкаў Манька з Надзяй, як і іншыя дзяўчаты, выбраліся ў Беласток купіць матэрыял на сукенкі. Ішлі босыя пехатой, гасцінцам, больш за трыццаць кіламетраў — так было бліжэй. Пад вечар выходзілі ў Войшкі, і там начавалі ў цёткі Тацяны. А як толькі крышачку развіднела і была бачна дарога, ішлі ў горад, а перад вечарам былі ўжо дома.

Вярнуўшыся з Беластока Надзя сумным голасам адказала маме, якая спыталася што купілі:

„Манька купіла матэрыял на мазайку — чырвоныя ружы на чорным фоне, а вось мне не хапіла грошай”. „Мо пазычыць старэйшая сястра якуюсь сваю сукенку хоць апрануць у царкву?” — падумала яна. Манька сама шыла сабе сукенкі, вучылася за краўчыху. І як сама казала: шыла ўначы, каб ніводная сяброўка не ўбачыла і не падгледзела фасона.

Свята хутка прыбліжалася. Старэйшыя рыхтавалі закуску, а моладзь „гнала” гарэлку ў Арабчыні. У лесе міліцыянеры не спалохаюць, і злосны сусед не ўбачыць. Прыедуць госці: родныя, дваюрадныя, знаёмыя... Будзе поўная хата. Напаіць, накарміць удоваль, а то і пераначаваць усіх трэба.

Спаса тады прыпадала ў нядзелю. Напэўна будзе шматлюдна. У чацвер тата, узяўшы карычневую торбу, паехаў у Бельск купіць сёе-тое. З самай раніцы прыйшла цётка Олька, маміна сваячніца:

— Мо, пазычыце мне маку, то ж у горадзе забылася купіць, а свайго сёлета не пасеяла. А якія ж палюшкі без маку? А хату, бачу, вы ўжо памылі, прыбралі.

— А, так, памылі дзяўчаты з панядзелка, — адказала мама, сыплючы ў торбачку мак.

Цётка падзякавала і хуценька зачыніла за сабою дзверы.

Мама звярнулася да Надзі:

— Ты толькі помні, што трэба дакладна замесці панадворак і вуліцу, каб усюды было чысценька!

— Яшчэ зарана, мама, пазамятаю заўтра або ў суботу, — адбуркнула сястра, злуючыся на ўсіх, што заўсёды ёй, а не Маньцы, прыпадаюць такія неганаровыя працы.

Я выбегла на вуліцу, каб пайсці да Мані. Насупраць Мараковай хаты ішлі гучна рагочучы дзяўчаты з Пескаў. Насустрач ім — цётка Яўдося, блізкая наша суседка з кашалём поўным яблык. З цікаўнасцю спыталася:

— Куды вы так выбраліся і чаму вам так весела?

— Ідзём прыбіраць царкву, праз два дні Спаса, будзем танцаваць, вельмі хочацца нарэшце паскакаць, а не дзень у дзень бегаць з сярпом у поле. Апранемся ў новыя мазайкі і будзем выбіраць самых харошых хлопцаў, — весела адказала адна з іх.

Хлопцы ад світання будавалі плашчадку — усцілалі падлогу з дошак, кругом якой ставілі бярозы. Наймалі гарманістаў, бывала што і з далёкай вёскі Качалы.

Манька занята святочнымі прыгатаваннямі, а перад усім прымерваннем па некалькі разоў новапашытай сукенкі, бунтавалася на бацьку, які загадаў памагчы звезці грэчку з поля. У грэчцы поўна асату, а як жа гэта пакалечыць рукі і ногі перад святам?

У суботу бабуля пагнала кароў у Грыднісак, мама занялася варэннем худок і пячэннем палюшкаў з макам і яблыкамі. Надзя замятала вуліцу, голасна талкуючы аб чымсьці Надзі, сяброўцы з суседства, якая таксама прыбірала свой панадворак. Толькі я адна не мела ніякіх абавязкаў, бегала сюды-туды за мамай і нецярпліва чакала булачак з макам.

Нарэшце падышоў Спас. Надвор'е стаяла, як амаль штогод, прыгожае, сонечнае і цёплае. Усе круціліся па хаце ўжо з самай раніцы. Даўно выгарэла ў печы, куды мама ўставіла тушыць авечае мяса і капусту. Манька засцілала ложак і клала вялікія падушкі, Надзя павяла каня на калёнію ўпнуць на ланцуг, а я з самай раніцы пабегла палічыць латкі цукернікаў на пляцы перад царквой. На вуліцы паяўлялася штораз больш святочна апранутых людзей: старых, маладых, дзяцей... Адзін за адным ехалі, бразгаючы па бруку, вазы з гасцямі. На наш панадворак заехалі ўжо тры фурманкі, з Войшкаў — бабуля Дарка з дзедкам Пятром, цётка Тацяна з дзядзькам Варфаламеем і дочкамі Манькай і Валькай, дзядзька Міша — вялікі спявак з жонкай Олькай. А яшчэ прыедуць далейшыя сваякі з Паўлаў, а мо і прыедуць знаёмыя, якія бацькам трапяць на вочы пад царквою. Тата штогод перад святам упамінаў маму: вары і пячы многа, лепш каб асталася закуска, чымсьці не хапіла, устыдна будзе.

Палічыўшы цукернікаў, я прыбегла дамоў, надзела сваю мінулагоднюю пашытую сястрой Манькай белую сукеначку ды зноў пашыбавала пад царкву. Там сустрэліся мы ўсе сяброўкі — дзве Мані, працяг ☞IV

II ☞працяг яшчэ памятае, што ў студзені гэтага года ўсе хваляваліся такімі справамі). І што бурмістр зарабляе, як кажуць, на руку 4 178 зл. штомесяц, хоць ён бурмістр і заадно войт Кляшчэлеўскай гміны (добра, што małżonka prowadzi działalność gospodarczą, бо як тут звесці канцы з канцамі). І пра праект „O tym trwa pamięć w mojej rodzinie”, які курыравалі члены Таварыства сяброў Кляшчэлеўскай зямлі. Мяне зацікавіў „Kącik gospodyni” з рэцэптам на бульбу начыненую не толькі грыбамі. Прыдалося б, каб паводле старадаўніх рэцэптаў, якія прыпомнілі ўдзельнікі праекта „O tym trwa pamięć w mojej rodzinie”, мясцовая „Карчма” карміла не толькі такіх турыстаў як я, але і мяшчан.

Некалькі слоў пра горад Кляшчэлі, бачаны прыезджымі, не толькі турыстамі.

У горадзе чыста. Ёсць некалькі крамаў з рознымі цэнамі на такія самыя прадукты. Падсілкавацца можна ў „Карчме”, а памаліцца ў залежнасці ад канфесіі або ў царкве, або ў касцёле. Пасярэдзіне горада — агромністы комплекс школ, парк з акуратнымі алейкамі і помнікам Жыгімонту Старому, які ў 1523 годзе надаў Кляшчэлям гарадскія правы, каб ніхто ўжо не думаў пра шкодныя і небяспечныя кляшчы, якіх не бракавала і не бракуе ў навакольнай пушчы.

Стараецца ўлада горада і члены Таварыства сяброў Кляшчэлеўскай зямлі, каб інфармацыя пра гісторыю і сучаснасць Кляшчэль і гміны (глядзі кампакт-дыск „Як птушкі вяртаюцца з выраю, каб шукаць пакінуўшых гнёзд” — „Jak ptaki powracamy, by starych szukać gniazd”) даходзіла да інтэрнаўтаў і карыстальнікаў камп'ютэраў.

Калі прысвойваў я інфармацыю пра ўладу горада і гміны з інтэрнэт-старонкі Кляшчэлеўскай гміны, зацікавіла мяне зусім не славянскае прозвішча мясцовага раднага: Сабор Гассоўн. Пэўна, падумаў я, Сабор так закахаўся ў нейкую кляшчэлеўскую прыгажуню, што пакінуў існуючы да гэтай пары свет і вырашыў жыць у Кляшчэлях. Ну, думаю, тэма для выдатных нашых беларускіх паэтаў, паэтэс(?). Астаецца толькі праблема, каму падкінуць такую рамантычную гісторыю: вядома што Віктар неадкладна ў паэтычнай форме запіша гісторыю Сабора і нейкай Марусі; Надзея разаб'е рамантыку на найдрабнейшыя душэўныя часцінкі; а можа тэмай заняліся б Міра, або Ян ці Валодзя, калі яшчэ ведаюць што такое рамантыка? Не рамантыка, а проза жыцця сутыкнула Гассоўна, зубнога ўрача, сірыйца з Кляшчэлямі. Так шчасліва склалася для Кляшчэль і навакольля, што дзесяткі гадоў таму сышліся дарогі выпускніка стаматалогіі беластоцкай Медыцынскай акадэміі з патрабаваннямі жыхароў і ўлад. А жонку прывёз Сабор з Сірыі (гэта інфармацыя для зацікаўленых рамантычнай гісторыяй).

І на канец турбуе мяне такая вось думка: калі назіраю за сучасным жыццём ці то Міхалова, ці Орлі, Кляшчэль, Нарвы, Нараўкі, Бельска і іншых мясцовасцей, узнікае пытанне чаму нідзе няма помніка, пастаўленага ў прэстыжным месцы мястэчка, з інфармацыяй пра яўрэяў, якія сотнямі гадоў жылі побач нас. Добра было б, каб у будучыні хтось памятаў і пра беларусаў, якія зараз жывуць у вышэйзгаданых мясцовасцях і якія ў натуральны спосаб, адрозны ад трагічнага лёсу яўрэяў, знікнуць дашчэнту, апалячыўшыся.

Тэкст і фота Міхася КУПТЭЛЯ

Святкаванні на Грабарцы

Святая Гара Грабарка знаходзіцца на Драгіцкім узвышшы, у паўднёвай частцы Паўночнападляшскага ўзвышша. Паблізу плыве рэчка Машчона. Грабарку акаляюць Нурэцкія лясы.

У XII стагоддзі тут узніклі першыя цэрквы, святары якіх трымалі сувязь з Кіеўскай і Уладзіміра-Галіцкай Руссю. Быў гэта час татарскіх набегаў. Тады ікона Праабражэння Гасподняга — Спаса Збавіцеля з царквы ў Мельніку была схавана ў лясах на Гары Грабарцы. Аднак гэтая ікона ў Мельнік не вярнулася, а прычынай гэтаму была адсутнасць зацікаўлення літоўскіх князёў развіццём культу іконы. У ходзе чарговых набегаў каштоўная ікона Спаса Збавіцеля прапала.

Летам 1710 года ў недалёкіх Сямятычах успыхнула эпідэмія халеры. Памерлых было на столькі многа, што людзі не паспявалі іх хаваць. У гэты жудасны час аднаму старэчы адкрылася відзежа, у адпаведнасці з якой людзям трэба было зрабіць крыж і занесці яго на Грабарку. Тыя людзі, якія з крыжам дабяруцца на гару і там памоляцца, будуць выратаваны. Так яно сталася і эпідэмія спынілася. Пасля гэтага мясцовае насельніцтва паставіла на гары капліцу. Пазней была ўзведзена царква.

З 1726 года паломнікі сталі рэгулярна наведваць Грабарку, асабліва на свята Праабражэння Гасподняга. У 1884 годзе айцец Іосіф Герміновіч закончыў 11-гадовы рамонт капліцы на Грабарцы. Былі адноўлены сцены, падлога, столь, фундаменты, дах і іканастас, пашыраны інтэр'ер храма. У 1947 годзе на Грабарцы быў заснаваны жаночы манастыр у гонар святых Марфы і Марыі, які ўзначаліла сястра Марыя. У 1948 годзе манастыр налічваў восем манашак, а ў жніўні гэтага ж года грабарская абіцель упершыню адзначыла тут свята Праабражэння Гасподняга. Пачаткі былі вельмі цяжкія, паколькі не было памяшканняў для манашак і грошай на іх пабудову. Першапачаткова манашкі жылі ў званіцы старой царквы. Пасля на гары быў узведзены драўляны домік (у ім цяпер знаходзіцца Дом паломніка). У 1956 годзе была пабудавана другая царква ў гонар іконы Божай Маці Усіх Тужлівых Радасць. Пад канец 1960-х гадоў, калі намесніцай манастыра была ігумення Варвара, быў праведзены рамонт Праабражэнскай царквы. У 1978-1980 гг. быў узведзены новы, мураваны манастырскі дом у гонар Успення Прасвятой Багародзіцы. Пасля смерці матушкі Варвары манастырскую абшчыну ўзначаліла ігумення Людміла. На яе долю выпала перажыць трагедыю, калі ноччу з 12 на 13 ліпеня 1990 года Праабражэнская царква была злачынна падпалена. У цудоўны спосаб з пажару ўцалелі толькі Евангелле і дзве іконы — св. Мікалая і Спаса Збавіцеля.

Праабражэнская царква

Рашэнне аб адбудове храма было прынята неадкладна. 17 мая 1988 г. мітрапаліт Сава асвяціў адбудаваную царкву. У выніку ахвярнасці праваслаўных вернікаў манастыр быў абведзены каменнай агароджай. Пракладзены былі таксама васьміметровай шырыні сходы з падножжа гары да Праабражэнскай царквы і пабудаваны аўтастаянкі вакол агароджы. У 2000 годзе на месцы старой студні з цудадзейнай вадой была ўзведзена новая ў выгдязе капліцы. У 2003 годзе пачалася пабудова новага дома плошчаю ў 2500 м^2, якім будуць карыстацца манашкі, іх госці і паломнікі.

Кожны можа сцвердзіць, што Святая Гара Грабарка — гэта цудоўнае, аздараўляльнае, святое месца. Яна з'яўляецца таксама Гарой Крыжоў. Крыжы традыцыйна прыносяць паломнікі ўжо стагоддзямі. Найбольш крыжоў паяўляецца напярэдадні Праабражэння Гасподняга. Адны паломнікі нясуць вялікія драўляныя крыжы, іншыя — зусім малыя з надпісамі на славянскіх мовах, у якіх утрымліваюцца просьбы або падзякі.

Паломнікі абмываюць цудадзейнай вадой хворыя месцы, а хустачкі пакідаюць

Сёлета святкаванні Праабражэння Гасподняга адбыліся 18 і 19 жніўня ў прысутнасці дзесяткаў тысяч паломнікаў. Зранку 18 жніўня на Святую Гару прыбывалі шматлікія групы паломнікаў. Апошні адрэзак дарогі ішлі яны на каленях, тройчы акружаючы царкву. Затым паломнікі ўкопвалі прынесеныя з сабой крыжы і ішлі да цудадзейнай крыніцы, каб абмыць хворыя месцы і стомленыя ногі святой вадой. Хустачкі, якімі паломнікі і айчынныя ды замежныя наведвальнікі выціраліся, пакідалі пры ручаі на зямлі або вешалі на галінках дрэў, што сімвалізуе развітанне з хваробай. Людзі бралі з сабой цудадзейную ваду са студні, каб падорыць яе сваім блізкім.

Вечарам перад Праабражэнскім храмам адбылося набажэнства, якое было пачаткам святкаванняў на Гары Грабарцы. Апоўначы быў адслужаны акафіст за памерлых. Усю ноч вернікі ўдзельнічалі ў літургіях. Прыступалі яны да споведзі, стаялі ў чарзе, каб пакланіцца мошчам св. Кацярыны. Навокал гарэлі свечкі. 19 жніўня ў 7 гадзін раніцы святую літургію ўзначаліў епіскап Міран. Галоўную літургію ў 10 гадзін раніцы адслужыў мітрапаліт Сава. На заканчэнне ўрачыстасцей мітрапаліт падзякаваў айчынным і замежным вернікам за ўдзел у святкаваннях і за ахвяраванні на разбудову гэтага святога месца. Урачыстасці закончыліся хрэсным ходам вакол храма.

Калі хто па якіх-небудзь прычынах не змог цяпер наведаць святое месца, павінен гэта зрабіць неадкладна. На Святой Гары Грабарцы можна абысці царкву на каленях, абмыцца ў крыніцы з цудадзейнай вадой, прыступіць да споведзі, памаліцца з блізкімі сярод крыжоў.

Тэкст і фота Андрэя ЯЛОЗЫ

III ☞ працяг Надзя і наша новая сяброўка з Пескаў, Нінка. Куплялі мы перадусім мачкі, „рачкі" і „каруўкі". Апрача цукерак я збірала паперчыкі ад усялякіх цукерак, якія дзеці раскідвалі па пляцы, каб заўтра заняцца стваранням карцін. Я брала розныя паперкі і ўкладвала ў сабе толькі цікавую кампазіцыю, наклейваючы іх на фанеру. Так стварала я карціны, якія мяне доўга цешылі.

З царквы госці вярталіся каля трэцяй гадзіны папоўдні. Калі я прыйшла дахаты, у нас на панадворку стаяла аж пяць вазоў, якімі прыбылі госці, а ля хлява, апершыся аб сценку, стаялі два веласіпеды. Некаторыя госці прыйшлі пехатой з суседніх вёсак. Мама і сёстры спрытна ўвіхаліся, падаючы ежу на сталы, тата ставіў бутэлькі гарэлкі і запрашаў займаць месца за сталамі. Госці елі, пілі і весяліліся. Вельмі прыгожа і гучна спявалі з певуном дзядзькам Мішам. Амаль з кожнай хаты разносіліся спевы, а пад вечар спявала моладзь, ідучы па вуліцы на плашчадку, на музыкі. Пажылыя госці раз'язджаліся дамоў і таксама дзерліся п'янымі галасамі на вазах. А тыя, якія асабліва любілі пагуляць, аставаліся нанач, спалі на саломе ў хаце; заўтра „папраўляліся" і амаль перад поўднем вярталіся дамоў. Такія госці здараліся і нам, ды бацькі іх не любілі.

Моладзь на музыкі прыязджала не толькі з акалічных вёсак, ды нават з тых больш аддаленых. Забава працягвалася аж да белага дня, а цётка Крысціна, як потым расказвалі дзяўчаты, стаяла на лаўцы ўсю ноч. Усё і ўсіх хацела падглянуць, каб потым доўгія тыдні мець аб чым талкаваць, штораз нанава пра тое самае. Яна была незамужняй, адзінокай жанчынай і гэта быў яе важны і прыемны занятак. Цётка Крысціна не прапусціла ніводнай забавы. Так штогод святкавалі ў нашай вёсцы Спаса.

* * *

Міналі гады, вёска мянялася. Моладзь уцякала ў горад, на работу — на фабрыкі, хлопцы ў міліцыю; малодшыя ішлі вучыцца ў школы. Штогод менш было рук да жніўнай працы. На калёніі выйшлі ўжо людзі не з сярпамі, а з косамі. Хоць не ўсе. Наш сусед, стары дзядзька Сцяпан, да канца жыцця жаў сярпамі. Казаў: „Косамі марнуецца многа каласкоў, ды і пожня высокая — марнуецца і салома". Ужо і я прыязджала са школы ў горадзе на жніво да бацькоў і памагала падбіраць жыта. І касцу было цяжка, і падбіраць збожжа нялёгка, ды работа ішла спраўней. Жніво канчалася намнога хутчэй. Толькі краявід палёў не змяняўся — далей на калёніях красаваліся роўныя радочкі ляшкаў. Толькі што пожня была высокая і няроўная. Відаць было, хто спрытны і менш спрытны касец.

Прайшло яшчэ пару дзесяткаў гадоў, а на палях паявіліся камбайны! Голыя палеткі без людзей, дзенідзе толькі лёскат камбайна і валкі павязанай саломы нязграбна параскідваныя па палосках. Весялосць і блізкасць гаспадарскаму сэрцу палёў назаўсёды прапала.

Прайшло 60 гадоў. Сёлета Спаса прыпала таксама ў нядзелю. Ужо ў пятніцу паехалі мы з сяброўкай Верай, як штогод, у Плёскі, у госці да маёй сястры Надзі, якая там купіла домік. У суботу прыгатаўлялі ежу, здавалася, як калісьці, усё як быццам бы — вярнулася.

Прыедуць Надзіны госці: сын з нявесткай і дачка. У бабулі Надзі канікулы праводзіць 11-гадовая Кася. Трэба нарыхтаваць усім смачны абед. Раніцай пайшлі мы з Верай у царкву памаліцца, пакуль няма ў храме тлуму. Паставіла я свечкі, памалілася за памерлых і за жывых. Пастаялі мы з Верай, паслухалі богаслужэння. Потым пайшлі мы на могілкі наведаць бацькоў, каб і ім у святачка запаліць свечачку на магіле, расказаць пра ўсё і пра сённяшняе Спаса: як многа людзей прыехала — машыны цягнуцца шнурком у адзін і ў другі бок вёскі аж да іх роднай хаткі, што амаль на кожным панадворку стаяць адна або і дзве машыны, што ў наш храм прыбылі аж 8 свяшчэннікаў, што прыгожая была пропаведзь, што хадзілі і спявалі, як і бывала, з хрэсным ходам вакол царквы, што свяцілі ўгару паднятыя праз дзесяткі рук яблычкі, а нават памідоры і макаўкі...

Мала знаёмых я ўбачыла пад царквой, адны ўжо, відаць, пастарэлі, іншыя паехалі на Святую Гару Грабарку. Вакол толькі незнаёмыя маладыя ды дзеці. Мы засталіся з Верай пераначаваць, аднак спеваў ні ў хатах, ні на вуліцы, не ўчулі. Пасля абеду толькі машына за машынай імчаліся вуліцай дамоў. Нашы госці таксама хутка паехалі. На лавачкі, адправіўшы гасцей, павыходзілі старэйшыя жыхары вёскі, а па вуліцы бегалі толькі малечы. Усюды амаль чутная польская мова. Іншыя людзі, іншае Спаса...

Да сустрэчы, мілыя аднавяскоўцы, праз год!

Ніна БРУЧКО